Літаратурная Беларусь

Выпуск № 11 (243) (лістапад)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ

facebook.com/litaraturnaja.belarus
t.me/litaraturnajabelarus

## Змест

1

**ЮБІЛЕЙ:** эсэ Марыі НОВІК «Адусюль я: з кожнай хаты, з кожнай вёскі…», прысвечанае 150-годдзю Алаізы ПАШКЕВІЧ-ЦЁТКІ ..... с. 1, 2

**НАРЫС:** «аповед жыцця» Уладзіміра МАРОЗА «Несуровы зімовы акіян» ..... с. 3

**ПРОЗА:** заканчэнне нізкі «слоў пра знаёмых маргіналаў» Адама ГЛОБУСА «Крыміналамерон» ..... с. 4

**ФОРУМ:** вершы Сяргея УКРАІНКІ, Язэпа ПАЛУБЯТКІ і Уладзіміра ВАСЬКО ..... с. 5

**ЧЫТАЛЬНЯ:** «казка не толькі для дарослых» Ірыны ХАДАРЭНКА «След саламандры» ..... с. 6, 7

**ПАЭЗІЯ:** нізка вершаў Алены ВАРАНЕЦ «Білет на адну паездку» ..... с. 8

**ДЗЕЦЯМ:** «дзедавы казкі» Міхася ЗІЗЮКА ..... с. 9

**ЭСЭ:** «ліст» Алеся ПАШКЕВІЧА да Яна СКРЫГАНА «Лапікавая коўдра» ..... с. 10, 11

**СВЕТ:** навіны і цікавосткі літаратурнага замежжа ..... с. 12

ЮБІЛЕЙ

# «Адусюль я: з кожнай хаты, з кожнай вёскі…»

## Да 150-годдзя Алаізы ПАШКЕВІЧ-ЦЁТКІ



Марыя НОВІК

*Там цвітуць лугі ў пастаралях,*
*там чакаюць нас дзве жанчыны:*
*маці ў сумных сваіх каралях*
*і Айчына.*

***Анатоль Сыс***

Яна прыйшла ў маё жыццё са школьнага падручніка па беларускай літаратуры. Прыгожая паненка ў нацыянальным строі. Не так шмат біяграфічных звестак, і, вядома ж, найперш акцэнт на яе грамадскую дзейнасць, на ўдзел у рэвалюцыйных падзеях таго часу. Верш «Мора» ўразіў сваёй незвычайнай энергіяй, сілай, рытмам ды вобразнасцю, якая нараджала ва ўяўленні школьніцы, якая не бачыла мора, такія неверагодныя карціны ды такую моц кроку і руху нязломленых духам: «Мы са сталі, мы з каменя. Нас кавалі / у пламенні, каб мацнейшымі мы сталі…» Рыхтавалася да паступлення на філалагічны факультэт, паўтарала біяграфіі пісьменнікаў і вершы напамяць, і такім дысанансам быў верш «Мора» ў маёй ідылічнай прасторы пад роднай яблыняй на хутары… Ды ў білеце будзе мне на іспыце расказаць пра творчасць Цёткі, будзе і чытанне гэтага верша, і адабрэнне Уладзіміра Андрэевіча Калесніка (як потым я зразумела, хто ацэньваў мой адказ). Так сталася, што і пад кіраўніцтвам Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага навуковая праца была пра мову Цёткі… Яна, Алаіза Пашкевіч, адкрыла для мяне новыя невядомыя прасторы Беларусі, беларускай культуры, таленавітых людзей… Удзячна ўспамінаецца тое маё самотнае падарожжа па мясцінах, звязаных з Алаізай Пашкевіч — Цёткай. І яна, Цётка — велічная і блізкая ў помніку скульптара А. Заспіцкага, і Стары Двор, мілыя гасцінныя людзі, якія шчыра адгукаліся на мае пытанні пра род Цёткі, іх запрашэнне на начлег, і гаворкі ў хаце, і іх шчымлівыя песні па-беларуску і па-польску… Ды тое магутнае дрэва ля яе магілы, і крыж на магіле, а яна — пры самай дарозе… Была і Вільня, і праца ў архіве, і незабыўная сустрэча з Зоськай Верас…

Сапраўды, ёсць нешта невытлумачальна магічнае ў гэтай неардынарнай прыгожай асобе — паэтцы, якая стала ўвасабленнем душы беларусаў, бо ў ёй спалучылася, выявілася і мілая дачка сваіх бацькоў, і дзейсная асоба, сяброўка інтэлігенцыі беларускай, што праяўляла сябе і ў Пецярбургу, і ў Вільні, і розных мястэчках Беларусі. Яна — навучэнка філасофскага факультэта, яна і даследчыца беларускай народнай культуры — батлейкі, беларускай народнай песні, збіральніца нацыянальных скарбаў Беларусі дзеля іх захавання ад знішчэння. Менавіта разам з беларускімі дзеячамі ды Іларыёнам Свянціцкім збіралася калекцыя беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў у Львове. Яна не толькі вывучала драматычнае мастацтва, але была сапраўднай акторкай у тэатры Ігната Буйніцкага… Таму і цікавасць да яе творчасці і лёсу з боку навукоўцаў, пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў не спыняецца, з кожным годам прыходзяць да беларусаў новыя кнігі, артыкулы, творы. Таму такімі важнымі застаюцца даследаванні Лідзіі Арабей, Вячаслава Рагойшы, Таццяны Кабржыцкай, Сяргея Панізніка, Ірыны Багдановіч і многіх іншых. Уражваюць мастацкія творы Валянціны Коўтун, Алеся Разанава, Анатоля Сыса, а таксама паэтычныя прысвячэнні Цёткі многіх беларускіх аўтараў. Сярод якіх самы першы твор-вітанне ад Янкі Купалы — «Аўтарцы скрыпкі беларускай». Паэтычных твораў, прысвечаных Цёткі, шмат. Уразілі глыбінёй, падводнымі вобразнымі плынямі паэма «Алаіза» Анатоля Сыса і «Паэма пераадолення» Алеся Разанава. «Мама, мама, выйдзі з хаты, у двор зязюля прыляцела…» Калі смутна стане на сэрцы, калі сэрца агорне жаль, калі паклічуць успаміны на родны падворак, чамусьці зноў і зноў прыгадаюцца гэтыя словы з «Паэмы пераадолення» Алеся Разанава — паэмы пра Алаізу Пашкевіч-Цётку. Зязюля, птушка — міфалагічны вобраз, шырока вядомы ў вуснай паэтычнай творчасці. Зязюля, зязюлька — адзін з пашыраных вобразаў-сімвалаў, скарыстаных Алаізай Пашкевіч, таму невыпадкова і ў мастацкіх творах пра паэтку гэты вобраз кранае, узбагачаецца новымі эмацыянальнымі і зместавымі асацыяцыямі. Адгукаюцца ў душы народныя песні пра зязюлю-дачку, зязюлю-маці:

*Ляцела зязязюля, дый стала куваці,*
*А то не зязюля, а родная маці…*

Невыпадкова ў афармленні кніг Цёткі выкарыстоўвалі мастакі вобраз зязюлькі. Гэтыя вобразы пераклікаюцца з творамі Алаізы Пашкевіч. І не толькі таму, што Цётка ў сваіх творах выявіла здольнасць прачула сказаць пра нялёгкую долю жанчыны ў сучасным для яе грамадстве. Гэта яшчэ і выява яе ўласных душэўных перажыванняў, якія так пачуццёва выразна выявіліся ў яе нарысах «З дарогі». Напісаны яны ў форме лістоў Анелькі да мамы-матулі, дзе яна, зболеная, аднак няскораная, пасылае і словы ўдзячнасці, і словы суцяшэння. І так шчымліва жалосна-пяшчотна гучыць яе голас: «Жыву з морам і часта табе, мамачка старэнькая, апроч лістоў, пасылаю на мора хвалях жывыя словы, бачу, як яны да цябе шпарка плывуць белымі лебедзямі, як перамяняюцца пасля ў шэрыя зязюлькі і кукуюць за рэчкай у дуброве».

І напярэдадні 150-гадовага юбілею Алаізы Пашкевіч, здаецца, гэта гучыць сардэчная просьба да Маці-Радзімы сустрэць сваю слаўную дачку: «Мама, мама, выйдзі з хаты, у двор зязюля прыляцела…

***

*Жаўранчыхі крычаць,*
*іхняе жыта зжалі.*

*Жаўранкі маўчаць,*
*як зерня ў рот набралі:*
*Чый гэта анёл,*
*голас такі гарачы?*
*Чыё гэта птушанё*
*па-беларуску плача?*

***Анатоль Сыс***

Сёння вядомыя многія звесткі з жыцця Алаізы Пашкевіч, многае распавядаюць нам яе творы, сярод якіх — не толькі паэзія, але і падарожныя нарысы, публіцыстычныя і навукова-папулярныя артыкулы, ліставанне. Як па-новаму адкрылася яе душа ў гэтых творах, якія з'явіліся ў найбольш поўным томіку выданняў, дзякуючы Сцяпану Александровічу.

Паэтка, акторка, міласэрная сястра, асветніца, яна марыла пра вольную Беларусь, пра адраджэнне нацыянальнай культуры, пра адраджэнне роднай мовы, рупілася, каб захаваць старажытныя памяткі, а найпершы клопат — пра захаванне душы беларуса. Таму невыпадкова вызначыла тое галоўнае, што робіць чалавека чалавекам, што ёсць самым вартасным: «Бедны той, хто, апрача грошы, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здалее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народу, да роднай мовы, — гэта вялікае мілаванне чалавека — слабога, пакрыўджанага». Яна запаліла «Лучынку», каб жыло Слова, каб яно кранала душы малых і маладых беларусаў, каб Слова дзеіла цуды — адраджала памяць роду, каб уздзейнічала на іх самае глыбіннае — Слова роднае, бо без яго — няма будучыні ў нацыі. Таму і сёння яе палымяны артыкул да моладзі беларускай гучыць так актуальна, так пранікнёна, так празрыста: «На вас — моладзі — ляжыць вялікая павіннасць: развіваць далей родну мову, узбагачываць свой народ знаннем і культурай». Заклікала не цурацца роднага слова, быць смелымі: «Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя».



Алаіза ПАШКЕВІЧ (ЦЁТКА). Акварэль Наталлі ВАЛЮКЕВІЧ. 2024 г.

Родная мова за мяжою становіцца раднейшай і даражэйшай… Многія мае знаёмыя, студэнты дзяліліся сваімі ўражаннямі пра тое, як сярод іншамоўнай супольнасці адкрываліся новым зместам, сэнсам, эмоцыяй словы, выразы сваёй роднай мовы, як яна паступова ўсё шырэй і глыбей запаўняла сабою душэўную прастору. Як на роднай зямлі ўсё вальней і ахвотней гаварылася па-беларуску…

*«Во то ж цяпер жыву я ў Львове, з украінцамі і ўніятамі заводжу знаёмства».*

Так пачынаўся допіс Алаізы Пашкевіч-Цёткі ад 28 чэрвеня 1906 года да прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы. Не думалася мне, што гэтыя словы Цёткі раптам набудуць такі рэальны для мяне змест, увасобяцца ў маю рэальнасць. Так пісала Цётка, калі вымушана была выехаць з Вільні ў Галіцыю. Тут, у Львове, стала вольнай слухачкай філасофскага факультэта Львоўскага ўніверсітэта, а пасля здабыла права быць студэнткай стацыянара. У мястэчку Жоўква, недалёка ад Львова, з падтрымкі Іларыёна Свянціцкага выйшлі з друку яе кнігі «Хрэст на свабоду», «Скрыпка беларуская». Тут і кніжачка-падарунак «Гасцінец для малых дзяцей». Львоў адкрыў для Алаізы Пашкевіч новыя магчымасці для працягу і сваёй грамадска-культурнай дзейнасці, і для асабістага духоўнага росту, для ахвярнай працы дзеля свайго народа.

**Заканчэнне на стар. 2 »**

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (243), лістапад 2026 года

# «Адусюль я: з кожнай хаты, з кожнай вёскі...»

## Да 150-годдзя Алаізы ПАШКЕВІЧ-ЦЁТКІ

**« Заканчэнне. Пачатак на стар. 1**

Тут, у Львове, шмат беларуска-ўкраінскіх шляхоў, якія даследаваліся беларускімі і ўкраінскімі навукоўцамі, літаратарамі, паэтамі. Пра беларуска-ўкраінскія стасункі вядомыя даследаванні Вячаслава Рагойшы і Таццяны Кабржыцкай, успаміны пра навучанне і жыццё ў Львове Сяргея Панізніка і Валянціны Коўтун, іх публікацыі пра жыццё Цёткі. І незвычайна — на мяжы XX і XXI стагоддзяў — у Львоўскім дзяржаўным універсітэце імя Івана Франко адкрываецца мажлівасць вывучаць украінскім студэнтам беларускую мову. Ці магла ўявіць такое Цётка? Але ж гэта рэальнасць, бо паміж Берасцейскім універсітэтам і Львоўскім універсітэтам заключана дамова, і 2000/2001 навучальны год пачынаецца для мяне з выкладчыцкай працы ў Львове. Так атрымалася, што зноў Цётка вяла мяне сваімі сцежкамі, адкрывала старажытны горад Львоў, украінскую культуру, украінска-беларускія культурныя стасункі. Тут, у Львове, на адным з карпусоў універсітэта — мемарыяльныя дошкі: Івана Франко і Алаізы Пашкевіч-Цёткі. Мае навучэнцы — студэнты факультэта журналістыкі, філалагічнага і гістарычнага факультэтаў. Дапытлівыя, разумныя, дзейсныя. Яны міла вучацца дзекаць і цекаць ды вымаўляць зацвярдзелыя... Хутка шукаюць агульнае і адрознае ў некалькіх мовах, далучаючы яшчэ і балгарскую, ахвотна мадэлююць дыялогі і радуюцца ўдачам.

Львоў адкрываўся невядомымі раней для мяне архітэктурнымі помнікамі, храмамі — і сабор святога Юра, і царква св. Вольгі і Елізаветы, і Высокі замак... І спевы-малітвы, якія, здавалася, узносіліся да самага неба, і са ступенек св. Юра здавалася, што спявае-моліцца ўвесь горад і гэтыя спевы чуюць нябёсы, бо ішло малітоўнае гучанне высока-высока, так высока, што душа замірала ад такой суладнасці зямлі і нябёсаў. Той Крыжовы Шлях застаўся ў маёй душы як увасабленне людской згуртаванасці і малітоўнай еднасці, гарманічнай суладнасці горада і людзей у ім, суладнасці такога зямнога, рэальнага, і нябеснага, сакральнага.

Вядома, як і многія іншыя, хто шукаў беларускі шлях у Львове, мне хацелася і прачытаць, і ўбачыць, таму з ласкі дырэктараў бібліятэк, музеяў мне быў зроблены дазвол на працу ў іх фондах. У Нацыянальны музей, што знаходзіўся на вуліцы Драгаманава, дзе доўгі час быў дырэктарам Іларыён Свянціцкі, каб пазнаёміцца з калекцыяй беларускіх твораў, можна было трапіць нават у перапынках паміж парамі, бо часам заняткі былі з самай раніцы, а пасля ўжо напрыканцы другой змены. Ад супрацоўніцы гэтага музея незнарок пачула, як яна казала сваёй супрацоўніцы: «Дырэктар прасіў спрыяння гэтай пані». Была дамова і з аддзелам рэдкай кнігі ў бібліятэцы імя Стэфаніка, дзе засталося незабыўнае ўражанне ад старадрукаў. Нацыянальны музей дазволіў пазнаёміцца з такімі каштоўнымі скарбамі — вынес мне ў скрутках слуцкія паясы! Яны разгортваліся перада мною сваімі дзівоснымі ўзорамі, пабліскваліх срэбныя і залатыя ніці, і доўга нельга было стрымаць трымценне, бо тут — сама гісторыя, талент, тут і Цётка. Шмат культурных і гістарычных памятак, як сцвярджаюць даследчыкі, было перададзена праз Цётку Іларыёну Свянціцкаму ды быў створаны Беларускі аддзел Львоўскага музея. І хочацца зрабіць фота, прыгожы буклет...

Ва ўніверсітэце шмат святаў з нагоды памятных датаў. Вечарына да дня нараджэння Шаўчэнкі. Уразіў мужчынскі выкладчыцкі хор. Сіла і прафесійнасць, і даўняя традыцыя. Да 225-годдзя прафесійнага тэатра ў Львове — чароўная музыка: скрыпкі і флейты, арыі з опер. Класічная музыка зачароўвае. У Львове, аказваецца, 30 гадоў жыў малодшы сын Моцарта.

Была і двухдзённая канферэнцыя да 125-годдзя Іларыёна Свянціцкага. Было і маё выступленне пра беларуска-ўкраінскія стасункі, пра творчае супрацоўніцтва І. Свянціцкага і Цёткі. Была і спасылка на пераклад твораў Алаізы Пашкевіч на ўкраінскую мову. Прадмову і пераклад твораў здзейсніў Раман Лубкіўскі. Спадабалася мне і была працытаваная ў выступленні цытата з прадмовы Рамана Лубкіўскага пра Лэсю Украінку і Цётку: «В нашій уяві вони завжди ітимуть поруч — мужні і незламні, полум'яні і ніжні — дві духовні посестри, дві безсмертні квіткі ломикаменю». Падчас фуршэту падышоў Р. Лубкіўскі — знаёміцца з беларускаю. Ён узначальваў тады аддзел культуры Львоўскай адміністрацыі. Пытаўся пра беларусаў, шкадаваў, што не запрасіў сяброў — В. Рагойшу і Т. Кабржыцкую. Напярэдзе было 125-годдзе Цёткі. Сказаў, што варта зладзіць вечарыну тут, у Львове. А ў Беларусі — запэўніла я — ён шаноўны госць заўсёды...

Назаўтра зранку было ўскладанне кветак да магілы І. Свянціцкага на Лычакоўскіх могілках. У гэтыя два дні канферэнцыі мела як да госці-беларускі такую шляхетную ўвагу з боку ўкраінскіх ўдзельнікаў... Раман Лубкіўскі ўспамінаў розныя гісторыі з сустрэчаў Лучука і Мальдзіса, а таксама ўласныя спогады пра Бураўкіна — разам працавалі ў ААН. Распавядаў пра Караткевіча, як той прыехаў, а ў гасцініцу не засяляюць, а як паказаў кнігу «Каласы пад сярпом тваім» — далі пакой. А праз два дні — таемна з'ехаў, і засталося пытанне: чаму так мала пабыў?

Працяг канферэнцыі на другі дзень быў у Нацыянальным музеі. Выстава кніг, фотаздымкі І. Свянціцкага, іконы. Была і Марыя Іларыёнаўна, дачка, яна захоўвае і асабісты архіў І. Свянціцкага. Гаварыла пра бацьку, маці, сям'ю, а падчас фуршэту пасля майго слова ўстала ды пачала чытаць Янку Купалу, гаварыла пра Цётку, прыгадала, што мае кнігу В. Коўтун пра Цётку. З працы І. Свянціцкага прыгадвала, што Янку Купалу ён параўноўваў з Шаўчэнкам, а Якуба Коласа — з Іванам Франко. Яе слова выклікала ў прысутных прыемнае здзіўленне. А пасля з Яраславай Паўлычко зайшлі да яе, яна запрасіла глянуць на яе жытло! Дзіва! Не жытло — музей. Фонды. Мора кніжак ды іншых памятак. Пэўна, яшчэ адкрыюцца новыя старонкі беларуска-ўкраінскіх культурных стасункаў.

Львоў падарыў маёй душы прыгожыя святы, калі гараджане напаўняюць незвычайным святлом, радасцю, малітоўнымі спевамі ўвесь горад. Так было на Вербніцу, на Вялікдзень, а таксама падчас прыезду папы Яна Паўла II. З ласкі выкладчыкаў кафедры славянскай філалогіі атрымала запрашэнне на дзве сустрэчы з ім. І гэта было незвычайнае паяднанне ў малітве, малітоўных спевах, калі дождж і хмары змяняюцца сонцам, святлом.

Арганныя канцэрты ў былым Дамініканскім саборы, і старажытныя спевы, і малітвы на ружанцы ў роднай украінцам мове адгукаліся ў сэрцы і радасцю і пытаннем: а ў нас? Былі экскурсіі са студэнтамі ў музеі горада. Ім хацелася правесці і паказаць свае памятныя мясціны. Гэта і этнаграфічны музей, і гістарычны, і манастыры. Назаўсёды засталося ўдушы здзіўленне і захапленне ад выставы пісанкі ў манастыры студытак, ад гісторыі пра ігуменню, украінку, якая пасля закрыцця манастыра апынулася ў Амерыцы, але працягвала ствараць пісанкі і пакінула запавет, што ўся калекцыя яе твораў вернецца ў манастыр, калі некалі яго адкрыюць. Так сталася. Крохкія пісанкі з Амерыкі шчасліва вярнуліся на радзіму і сёння цешаць сэрца наведвальнікаў незвычайным дзівам мастачкі.

Былі і шчаслівыя адкрыцці пра стасункі мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага з беларускай інтэлігенцыяй ды беларускімі рэлігійнымі дзеячамі. У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Львова захоўваецца арыгінал рукапісу — пасланне Мітрапаліта А. Шаптыцкага, датаванае 15 сакавіка 1909 г. У гэтым лісце — выява пастырскае любові да беларускага народу, клопат пра святую Унію на беларускіх землях, вера ў выратаванне праз веру, праз любоў да Ісуса Хрыста.

З ласкі супрацоўнікаў Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіву Львова быў атрыманы дазвол на публікацыю ў беларускім друку гэтага ліста, невядомы на той час шырокай грамадскасці. Гэта Пастырскі ліст, у якім і запавет Мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага, і яго бласлаўленне беларускаму народу. Вось толькі невялічкі ўрывак з таго ліста:

*«Хочу Вам, однак, лишити сей доказ моєї пастирської любові і моєї печаливости о Ваше добро — о дочасне і вічне Ваше добро. Всі предмети церковної минувшости Вашего Краю — всі памятки Святої Унії на Білій Руси я старанно збирав — і всі ті памятки Вам лишаю.*

*За Божою ласкою дійдэ до того, що будете мати правного уніцкого пастиря, Архієпископа Полоцкого. Ему все передадуть з просьбою від мене, щоб ті святі памятки зберігав для наступаючих поколінь.*

*Се же письмо лишаю на те, щоб оно Вам принесло по моїй смерти моє поздровлення пастирське, мою любов і Боже Слово — науку, яку я не міг, так як хотів, Вам голосити».*

Пра сустрэчы Мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага з беларускай інтэлігенцыяй, з беларускай моладдзю — найперш студэнтамі Духоўнае Каталіцкае Акадэміі ў Пецярбурзе — сведчаць успаміны а. Вінцэнта Гадлеўскага ды а. Адама Станкевіча.

У Цэнтральным гістарычным архіве Львова мне пашчасціла знайсці пацвярджанне перапіскі Мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага і Антона Луцкевіча. Гэта тры рукапісныя лісты А. Луцкевіча да Мітрапаліта А. Шаптыцкага, напісаныя ў верасні 1931 года, а таксама ліст а. Льва Гарошкі.

Так адкрываў для мяне Львоў цікавыя старонкі беларуска-ўкраінскіх узаемасувязяў, старонкі адраджэння духоўнага жыцця на прасторах Украіны і Беларусі. Так адгукнулася мне Цётка.

***

*«Яшчэ калісь, як была я ў Рыме, каля твораў Рафаэля прайшла з сэрцам спакойным, затое перад Анджэла Буанароці і Леанарда да Вінчы анямела ўсімі сваімі чуццямі, думкамі склепілася і стаяла гадзінамі, акамянелая з задзіву...»*

***Цётка***

Сцежкі-дарожкі Цёткі-падарожніцы не могуць не здзіўляць. З хутара Пешчына, ад Старога Двара разбегліся яе жыццёвыя дарогі да вёсак, мястэчак і гарадоў роднай Беларусі. Гародня, Ліда, Вільня, Пецярбург, Львоў... А пасля і Закапанэ, Кракаў, Дрэздэн, Генуя, Ментона, Ніцца... Італія, Нямеччына, Фінляндыя, Швецыя... Не толькі слухала лекцыі пра еўрапейскае мастацтва, але і адкрывала ў музеях Еўропы шэдэўры сусветна вядомых творцаў. Ці думала Цётка, што яе асоба натхніць мастакоў яе роднай зямлі на творы мастацтва розных жанраў?!

Да 100-гадовага юбілею з дня нараджэння Алаізы Пашкевіч у Мінску была наладжана выстава, якая выклікала вялікую цікавасць у наведвальнікаў. Было прапанавана каля 100 твораў 60 мастакоў! Валянціна Трыгубовіч, высока ацэньваючы працы сталых і маладых аўтараў, адзначыла, што «творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва адкрывалі гледачу не толькі няўрымслівую Цётку, але і мастакоў-энтузіястаў». З прапановы Ф. М. Янкоўскага і спрыяння В. Трыгубовіч адкрылася і для мяне частка той вялікай мастацкай выставы (праз 10 гадоў пасля яе адкрыцця!). На той час шмат твораў разышлося, хоць, на думку В. Трыгубовіч, тады, падчас святкавання 100-гадовага юбілею Цёткі, ды і праз 10 гадоў «меркавалася, што яны стануць асновай будучага музею паэткі». Пэўна, так некалі будзе, бо не перастане здзіўляць мужнасць і сіла яе, ахвярнасць і высакароднасць, міласэрнасць і патрыятычная ўзнёсласць.

Прыгожая, таленавітая, такая шматгранная Цётка стала для беларусаў увасабленнем гонару і годнасці, дзеі і руху не толькі на шляху самаўдасканаленння, духоўнага развіцця, але і дзейснага творчага нацыянальна-культурнага развіцця, беларускага нацыянальнага адраджэння. І ў год яе 150-годдзя прыгадваецца яе рупнасць дзеля стварэння «Першага чытання для дзетак беларусаў», яе клопат пра малітоўнічак на беларускай мове, яе дзейсны ўдзел у адкрыцці беларускіх школ. Згадаеш яе, рэдактарку часопіса «Лучынка», яе, акторку і дэкламатарку мастацкіх твораў, яе, даследчыцу беларускай народнай творчасці, батлейкі, яе, аўтарку навукова-папулярных нарысаў для дзяцей, моладзі — і ўзнікае запытанне: што маем мы сёння ў сваім родным краі, які наш палетак, наша беларуская ніва? Ды ўсё ж грае скрыпка беларуская, кліча грайка-скрыпалька да ахвярнай стваральнай працы дзеля сваёй Радзімы-Бацькаўшчыны, дзеля жыцця роднай мовы, гісторыі і культуры, дзеля красы зямлі і чалавека, дзеля сцвярджэння і праяўлення найлепшых скарбаў душы. І з надзеяй скажам словамі Анатоля Сыса, аўтара паэмы «Алаіза»:

*Поле спеліць вянец жытнёвы,*
*акрыяюць нямыя вусны,*
*нібы людзі, збяруцца*
*словы,*
*нібы рэкі,*
*успомняць вусце.*

# Несуровы зімовы акіян

## З аповедаў жыцця



Уладзімір МАРОЗ

Магчыма, і няёмка ў маім узросце выказваць гарачую непрыхаваную прыхільнасць да пэўных асобаў, фактаў, прыродных з’яў, але тут устрымацца не магу: я палюбіў акіян! Ён мае назву — Атлантычны, таму паэтычны вобраз слова «акіян» амбівалентны — і абстрактны, і канкрэтны адначасна. Я вырас на Нёмане і з Нёманам недалёка ад яго вытокаў, дзе рака яшчэ зусім нешырокая, інтымная, свойская, і няпроста ўявіць, што з набліжэннем да мора, якое чакае нёманскія воды, яна набывае адпаведную саліднасць. Але на пэўным жыццёвым і творчым адрэзку зразумеў, што з Нёмана вырас і дарос да акіяна. Як быццам сам з нёманскай вадой дапяў да Балтыйскага мора, а потым і Атлантычнага акіяна. Хоць насамрэч акіян я шпершыню разгледзеў з іншага яго боку, з усходняга ўзбярэжжа Амерыкі. Сказаць тут трэба «дзякуй» старэйшаму сыну Цімоху, якога лёс і мэтанакіраванасць закінулі ў краіну з назвай Злучаныя Штаты Амерыкі. Я апынуўся там амаль два дзесяцігоддзі таму назад, першы раз убачыў акіян з борта самалёта, ды і потым пад’язджалі на акіянскі бераг, калі сын жыў у штаце Нью-Джэрсі. Але павяртанне да незваротнай любові адбылося гады чатыры таму ў Флорыдзе, куды пераехаў з сям’ёй жыць сын. У другі наш побыт у сонечным штаце ён зняў для бацькоў апартаменты на самым беразе акіяна, нават не на першай, а на нулявой лініі, як вызначыў бы я. Адзін крок з двара дома, дзе лагодны блакітны спакой басейна, — і ты на беразе воднай стыхіі, на якую можна глядзець бясконца, займацца медытацыяй, калі каму хочацца прыгожага вызначэння. Проста глядзіш на хвалі, а яны несупынныя, нястомныя і кожнага разу адрозныя. Хоцькі-няхоцькі задумаешся аб вечным, а калі і не аб тым, то рытм хваляў разбудзіць паэзію, якая ўсё роўна паверне на філасофскасць. Ці проста робіш нетаропкі ранішні шпацыр па мяккім пясчаным пляжы, калі хвалі на зыходзе мякка і пяшчотна абмываюць твае ногі, гаюча лашчаць іх сваёй салёнай вадой. Тут можна падумаць, што я ніколі не бачыў мора, вялікіх водных прастораў, таму і зачараваўся адразу. Ды не! І з Балтыйскім добра знаёмы, і на Чорным адпачываў неаднойчы, і на Міжземным, Цірэнскім, Адрыятычным быў. Але такога адчування не здаралася, бо падсвядома прысутнічала, што вось там недалёка Швецыя, там — Турэччына, там — Албанія… А ў выпадку з акіянам уявіць недзе, хай сабе і вельмі далёка, другі бераг немагчыма. Можна, зразумела, глянуць на паралель на глобусе і зразумець вачыма, што праз акіян насупраць Флорыды ўваткнешся ў аніяк не вядомую табе пустэльню Сахара на паўночным захадзе Афрыкі. Але не душою, бо гэта ўжо нейкі недасягальны іншасвет. Бо перад табой адзіная рэальнасць: акіян на доўгія тысячы кіламетраў. Таму, калі малодшы Даніла апынуўся ў Бостане, дакладней, у Кембрыджы (гарады падзяляе толькі рака Чарльз), дзе месціцца Гарвардскі ўніверсітэт, я нагадваў яму, каб дабраўся хоць калі да сапраўднага берага акіяна. Не пашкадуеш! Справа ў тым, што ўсходняе ўзмор’е ЗША аніяк не простая лінія, яно зрэзана вусцямі рэк, шматлікімі затокамі, паўвыспамі, мысамі, выспамі — да вольнай воднай стыхіі яшчэ трэба дабрацца, што вымагае добрага часу і аўтамабіля, без якога тут аніяк. Тым не менш, рэкамендацыі сыну ўбачыць акіян выдавалі маё жаданне падзяліцца сваёй далучанасцю да яго таямніц. Неяк сын адказаў, што дапяў чыстага берага, але выдавала на тое, што гэта была адгаворка, каб бацька не чапляўся з абы-чым. Не дзеля ж акіяна Даніла прыехаў у Гарвардскі ўніверсітэт, а набыць добрую адукацыю! Але ж мне рупіць! Таму адной з просьбаў, калі збіраліся ў Бостан адведаць сына праз паўтара года ягонай вучобы, было пажаданне трапіць на зімовы акіян.

*

Так здарылася, што на працягу года мы з Вольгай двойчы ляталі ў Амерыку. Па адной візе — толькі білеты паспявай купляць. Летам былі ў Флорыдзе, а зімой, ужо ў студзені, выбраліся ў Бостан. Асвойталі галандскія авіялініі KLM з перасадкай, адпаведна, у Амстэрдаме. Другі раз гэты вялікі, але без прэзентацыйнага бляску аэрапорт быў ужо добра знаёмы, іхняе галандскае фірмовае піва «Хайнекэн» каштавалі ў адным і тым жа, як і ў першы раз, бары. Пералёт у Амерыку праз акіян заўсёды вялікае нязручча — і вельмі доўгі па часе (восем-дзесяць гадзінаў), і бяссонна-ночны, бо як не круціся на сядзенні, зручна адкінуцца на сон не ўдаецца. Але ж іншага выйсця няма. На гэты раз наш пералёт у Бостан для мяне вызначыўся як уцёкі ад ночы праз акіян. Калі глянуць ва ілюмінатар, то наперадзе відаць яшчэ светлая паласка неба (заход сонца), а ззаду цемра. Ляцім на захад з той жа хуткасцю, што і пасоўваецца час, гэта насамрэч уцёкі ад ночы. А недзе там знізу — акіян…

У Бостанскім аэрапорце не хутка, але абсалютна спакойна прайшлі памежны кантроль, забралі чамаданы і кінуліся ў абдымкі Данілы, які чакаў нас ужо з паўгадзіны. Ды на аўтобусе па падземных вуліцах у горад. Што прыемна — аплаты там не патрабавалася. Так гасцінна сустракаў нас Бостан. Выбраліся на паверхню ў цэнтры, я адразу з цікаўнасцю пачаў убіраць вачыма пакуль абсалютна незнаёмы вечаровы горад. Да апартаментаў, якія зняў нам Даніла, было недалёка. Засяліліся, ды зладзілі вячэру, больш для Данілы, бо мы пасля самалётнага перакусу былі не галодныя. Агледзеліся з жыллём — тыпова амерыканскі падыход. Пакой адзін — тут і ложак (спальня), і столік з канапаю (гасціная). Прыбіральны пакой як звычайна, толькі не з ваннай, а душам. А кухняй даводзіцца называць вузенькі пакойчык з праходам для аднаго чалавека каля лядоўні, газавай пліты і кухоннай шафы. Такое ўладкаванне жытла з разлікам, што людзі збольшага павінны харчавацца ў фастфудах, кавярнях і рэстарацыях. Гадоў дзесятак гэта мела рацыю, але з цягам часу жыццё і грамадскае харчаванне ў Амерыцы стала далёка нятанным. Так і мы на другі ж дзень паехалі на Uber у супермаркет і затварыліся прадуктамі на цэлы тыдзень нашага гасцявання.

Дом наш месціўся ў самым цэнтры Бостана, побач з цэнтральным гарадскім паркам. Разгледзеліся і з краявідам з акна. Тут якраз пасуе слова «урбаністычны». Знізу пляскатыя дахі невысокіх збудаванняў нежылога характару з наўтыканымі трубамі, з якіх валіць густы дым. Далей ідзе наступ высокіх будынкаў з ужо сапраўднымі хмарачосамі на заднім плане. Насамрэч «каменныя джунглі» — пераконваешся, што выраз гэты, вобраз вельмі трапны. І відаць толькі адна вузкая ў параўнанні з высокімі будынкамі вуліца. Я не адразу зразумеў, што ў ёй не так. Перад святлафорам спрэс чырвоныя агеньчыкі стоп-сігналаў машын, і гэтая дробная чырвань стварае нейкі эфект напружанасці, трывожнасці. А белага святла фар з-за таго, што вуліца з аднабаковым рухам (у гэтым была не адразу знойдзеная мной разгадка), няма. Адсюль такая нервовасць чырвані. Але ўсякія непатрэбныя адчуванні згладжвала тое, што ўсё рухалася, жыло. Гэта ж Амерыка, сябры.



*

Несуровы зімовы акіян стаў для мяне галоўным пунктам нашай вандроўкі ў Бостан. Яшчэ раней сын казаў, што калі не паедзем у панядзелак сустрэцца з Цімохам у нейкі не такі і далёкі горад, куды старэйшы сын прыляціць па сваіх рабочых справах, то машыну напракат усё роўна браць будзем. Каб з’ездзіць на акіян, як я зразумеў. Так і сталася. У пятніцу ён па мабільным заказаў Форд Фіеста, заплаціў. Каштавала з усімі падаткамі 84 даляры. З улікам таго, што вярнуць павінен быў таксама з поўным бакам, за бензін заплаціў потым 16 даляраў. Так што роўна ў сто мы ўклаліся, што вызначылі як харошы варыянт. Мяне адно крыху турбавала, як сын будзе за рулём, бо практыкі сталай не было ўжо даўно. Але сын вёў машыну проста і спакойна. А шлях наш ляжаў на Кейп Код (Cape Cod), курортную паўвыспу ў выглядзе сярпа за сто дваццаць кіламетраў ад Бостана.

Дарога выдатная, машын у суботу усё ж не так і шмат, коцімся сабе даволі шпарка. Трымаю ў руках тэлефон Данілы, які цяпер працуе навігатарам. Але і так зразумела, куды ехаць, Кейп Код пазначаны на паказальніках з зайдроснай рэгулярнасцю. Спачатку даехалі ў паўднёвую яго частку. Акіян убачылі. Але там заліў, потым выспа ці паўвыспа, таму чаканага ўражання не было. Папілі кавы ды паехалі далей. І ўжо недзе на сярэдзіне сярпа звярнулі да берага. Тут была агромністая паркоўка, цяпер практычна пустая, наўзбоч некалькі дамкоў — прыбіральня ды раздзявальня для мужчын і жанчын, зачыненыя на зімовы сезон. Бераг высокі, да вады трэба спускацца па драўлянай лесвіцы. Затое пясчанае ўзбярэжжа і сапраўдны акіян перад вачыма!

Вось яно, чаканае і вельмі ўразлівае для мяне здарэнне. Ходзім па беразе акіяна, радуемся. Даніла проста ў захапленні, што мяне радавала — нездарма цягнуў да воднай стыхіі сына. Потым на беразе каля раздзявальні селі за столік ды паабедалі рысам з сасіскамі і мясам. Як смачна елася! Асабліва я быў рады за сына, бо маладому чалавеку заўсёды хочацца есці. Запілі чыстай вадой — ды зноў да акіяна. Прахалодна, але Даніла папрасіў, каб я зрабіў фотасесію з ім у пільчаку. Атрымалася нязгорш — паясны партрэт маладога чалавека, выразны твар, бераг, хвалі, што нястомна накочваюцца на пясок. Увогуле, нават цяжка перадаць адчуванне, што ты наадзіноце з акіянам, што ён цяпер цалкам твой хоць на імгненне, бо насамрэч яму да цябе якая справа? Сустрэча з бясконцай вадой зрабіла завершанай нашую вандроўку ў Бостан. А дзеля дакладнасці для цікаўных адзначу, што Кейп Код перакладаецца як «мыс траскі», гэта самая усходняя частка штата Масачусэтс.

У гэты прыезд Вольга чамусьці думала, што ёй павіннен выкінуцца фарт у латэрэю. У час нашых вандровак да старэйшага сваты́ заўсёды куплялі нам па білеціку, дзе фальгу трэба сціраць манетай. Бывала, і выйгравалі пяць ці дзесяць даляраў. Але цяпер жонка разлічвала на буйную суму. Латэрэі па пяць даляраў купілі яшчэ ў Бостане, але ўскрываць іх вырашылі якраз на беразе акіяна. Сціраем аднацэнтавай манеткай абарончы слой, з’яўляюцца лічбы, але не адна з іх у абодвух выпадках не супадае з указанымі для параўнання. Не шанец. Але каб вельмі, то не засмуціліся — немагчыма быць смутным каля акіяна. Тым больш, навіны прачыталі добрыя. Мы ў Амерыцы, а амерыканскі дзяржсакратар Майкл Пампеа — у Беларусі. Выдатна, што ён усё ж прыехаў. Галоўным для нас было сцвярджэнне вяртання ў Мінск амерыканскага амбасадара. То, можа, нам з Вольгай дадуць нарэшце візу на пяць гадоў?

У Бостан вярталіся ўжо цёмначы. Спрэс суцэльная урбанізацыя, расквечаны агнямі горад. А недзе там застаўся адзінокі акіян са сваім прызначэннем нястомна накочваць хвалі на бераг. У поўнай цішыні.

Калі наступная з ім сустрэча?

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (243), лістапад 2026 года

# Крыміналамерон

## Словы пра знаёмых маргіналаў



Адам ГЛОБУС

*Заканчэнне. Пачатак у кастрычніцкім выпуску (№ 10 (242) за 2026 г.)*

### Наталля і лісты

Рукапісы не гараць? Яшчэ як гараць, гніюць і парахнеюць. Нават рукапісы таленавітых і геніяльных літаратараў сыходзяць у нябыт. Зразумела, зніштажэнне каштоўных рукапісаў — крымінальны ўчынак. Ці можна такі ўчынак апраўдаць? Хто яго ведае, тым больш, што я не збіраюся выступаць адвакатам у падобных справах. Наталля — сястра Уладзіміра Караткевіча — выкінула на сметнік цэлы мех з лістамі брата. Пра тое яна расказвала сваёй суседцы — маёй маці. Сотні лістоў Караткевіча да сваёй любімай сястры прапалі незваротна. Наталля скардзілася, што ёй, жонцы афіцэра, даводзілася шмат пераязджаць з кватэры на кватэру, з горада ў горад. Шораз перад пераездам трэба было зводзіць колькасць рэчаў да мінімуму, і ў нейкі момант ёй надакучыла цягаць мяшок з братавымі лістамі. «Я ж тады і думаць не думала, што гэтыя лісты некаму, акрамя мяне, яшчэ могуць спатрэбіцца!» Наталля моцна шкадавала, што знішчыла лісты, але знаходзіла сабе апраўданне, расказваючы пра цяжкае паходнае жыццё жонкі вайскоўца. Мяне ў гэтай сумнай гісторыі зацікавіў толькі доказ таго, што рукапісы згараюць, згніваюць і парахнеюць… Тут і згадваюцца словы любімага паэта беларусаў — Багдановіча: «Усё знікае і следу нат не кіне, як шэры попел ад чорнага агнішча, развеяны вятрыскам».

### Андрэй і стрэл

Андрэй стрэліў у хлопчыка. Стрэліў ды пацэліў. Мог бы і прамахнуцца. Мог бы проста папужаць хлопчыкаў, што залезлі ў сад па яблыкі. Стрэлу ў цёмнае вечаровае неба хапіла б, каб напалохаць нахабных школьнікаў, якія паквапіліся на чужы яблык. Андрэй быў п'яны, пэўна таму і не разгледзеў у змрочным садзе, што на яблыні сядзіць не дарослы злодзей, а дзіця горкае. Нават у дарослага крадуна яблыкаў я не страляў бы. Але Андрэй іншы. Ён жыў на вуліцы Беламорскай у прасторным цагляным доме, які шчодрая дзяржава збудавала для ягонага знакамітага бацькі. Ён, мусіць, меў і дазвол на пісталет, каб ахоўваць дом ды сваіх састарэлых бацькоў. Ён яго і ахоўваў разам з дзевяццю сабакамі. Брахлівыя сабакі так напалохалі крадуноў, што тыя пазалезлі на дрэвы, а раз'юшаны Андрэй выхапіў пісталет і стрэліў, і пацэліў, і параніў хлопчыка. Добра, што не забіў. Хоць у гэтым моманце ўсім пашанцавала. Зразумела, што адбыўся суд. Андрэю далі два гады ўмоўна. Адвакат быў моцны, ну і сувязі знакамітага бацькі дапамаглі. Маé адносіны з Андрэем пасля таго стрэла змяніліся да горшага. Мы часам выпадкова сустракаліся, віталіся, Андрэй прасіў у мяне цыгарэту, і мы курылі моўчкі, бо абмяркоўваць ягоны стрэл не хацелі, а ўсё астатняе падавалася малазначным.

### Гена і капейкі

У гастраноме Гена скраў пакецік з канцэнтратам для прыгатавання супу харчо. Як для мяне, тое харчо — гадасць несусветная. І вострае, і смярдзючае, і колер няўежны. Праўда, яно было таннае: каштавала шэсць капеек. Тады запалкі прадаваліся за адну капейку. Гена краў харчо, бо спадзяваўся пратрымацца на тым супе пару дзён да стыпендыі і верыў, што за капейкі ніхто ляманту падымаць не стане. Памыліўся студэнт. Лямант падняла дырэктарка гастранома: «Я знарок давяду справу да суда. Задзяўблі мяне дробныя крадзяжы валасатых студэнтаў. Пасадзіць не пасаджу, але розгалас пойдзе, з інстытута крадуна выкінуць. Крадзяжоў стане менеў». Дырэктарка не адступілася ад жорсткіх намераў, і Гену выкінулі з інстытута. Праз пакецік харчо ён згубіў цэлы вучэбны год. Праз год яго аднавілі, Гена не толькі скончыў інстытут, ён яшчэ і застаўся ў ім працаваць выкладчыкам, і тры гады выкладаў у мяне кампазіцыю. Расказваў, як ствараць кампазіцыйны кампот, а як хто краў і варыў капеечнае харчо — мне расказвалі іншыя людзі.

### Хац і Парыж

У касцельных сутарэннях Хац знайшоў скрыні з бутэлькамі вады баржомі. Металічныя коркі на бутэльках пабіла іржа, а папяровыя налепкі паела плесня. Пэўна, у сутарэннях некалі працаваў прадуктовы склад, потым склад пераехаў, а сапсаваную мінеральную ваду кінулі. Хац прапанаваў мне выліць баржомі, а бутэлькі памыць і здаць. Правярнуць нешта падобнае можна ў шматлюдным Мінску, але не ў Мсціславе, дзе ўсе адзін аднога бачаць. Карацей, я адгаварыў Хаца ад крадзяжу бутэлек. Можа, я адгаварыў бы яго і ад спробы ўгнаць самалёт, каб ён мне пра яго расказаў. Не расказаў, што з кавалкаў мыла зрабіў муляж бомбы, з якім сеў у самалёт «Мінск-Растоў» і праз сцюардэсу загадаў лётчыкам кіравацца ў Парыж. Лётчыкі паглядзелі на Хаца, ацанілі яго магчымасці і пасадзілі свой «Ту-134» не ў Парыжы, а ў Растове. Сердабольныя дактары знайшлі ў Хаца прыкметы шаленства, дазволілі перавезці хворага ў беларускую лякарню, а пасля лячэння выпусцілі на волю.

### Крыга і лазня

Лазня — не маё задавальненне. Шмат хто кайфуе ў лазні, а мне там цяжка дыхаецца і цяжка думаецца. У лазні я дурэю, і не толькі я там трачу розум. Ёсць фацэты, якім падабаецца ў лазні дурэць. Вось Крыгу дурэць падабалася, ён выпіў у лазні і адурэў да страты розуму. Выпіваў Крыга з сябручком, выпіваў і закусваў, але закусваў слаба. Пры закусцы ляжалі відэльцы і нажы. Крыга хапануў нож і ўдарыў сябручку ў грудзі. Так, сябручок той сварыўся з Крыгаю, насміхаўся, лыбіўся і рагатаў… І дарагатаўся да таго, што ў лазні нож прабіў ягонае вясёлае і рагатушчае сэрца. Лазня, у якой Крыга зарэзаў сябручка, стаяла ў доме творчасці «Іслач», што пад Мінскам, адразу за Ракавам. Дом творчасці збудавалі для пісьменнікаў, за пісьменніцкія грошы. Для рабочых і сялян тады будавалі дамы адпачынкаў, а для мастакоў і пісьменнікаў — дамы творчасці. Пісьменнік Крыга ўтварыў забойства ў лазні. Такая вось творчасць атрымалася ў Крыгі. Пасля той трагедыі я лазню ў «Іслачы» абыходзіў дзясятай дарогай, бо Дом творчасці пачаў паціху занепадаць, і ў лазні той парыліся ўжо не пісьменнікі з сябручкамі, а мінскія крымінальнікі з сяброўкамі. Дзіўна, што забойства ў той пісьменніцкай лазні было толькі адно. Мо і не адно, але я ведаю пра адно, калі Крыга зарэзаў сябручка.

### Алег і зайздрасць

У дзіцячым садку адны дзеці зайздросцілі іншым. Нагоды былі самыя розныя… Некаму падаравалі ровар — чым не матыў, каб зайздросціць. У кагось тата перасеў са старога дабітага грузавіка на новую «Калхіду». Ёсць чым пахваліцца перад аднагрупнікамі. Дарэчы, дзеці шафёраў і сапраўды выклікалі шмат зайздрасці, бо іх тата мог падвезці сына ці дачку да самай брамы нашага сада, які належаў будаўнічаму трэсту. Але ў адзін чорны ранак наша зайздрасць да дзяцей з іх бацькамі-шафёрамі ўзяла ды выпарылася. Тата Алега прывёз сына ў сад, высадзіў каля брамы, а калі разварочваўся, задавіў свайго хлопца заднім колам. Цэлы тыдзень у садзе панавала прыгнечанасць, выхавацелькі ледзь стрымлівалі слёзы, а некаторыя нянькі хаваліся і плакалі. Смерць дзіцяці — страшная з'ява, пагатоў — смерць уласнага сына, смерць, у якой вінаваты не чужы чалавек, а родны тата. І няхай гэту трагедыю назавуць «забойствам па неасцярожнасці», і хай ніякага злога намеру ў тым забойстве не праглядаецца, але ніхто табе дзіця з магілы не падыме, і давядзецца з гэтым болем векаваць. Праўда, зайздрасці пасля заўчаснай смерці Алега ў нашым садку стала крыху менш.

### Гвардзеец і колер

Так бывае, што праз нейкую драбязу цябе пачынаюць зневажаць, праследаваць і выганяць. Быў час, калі ў Мінску юнакам забаранялі насіць доўгія валасы. Гэта ж бітламанія, гэта ж хіпізм, гэта ж маральнае падзенне ў чыстым выглядзе, гэта ж крымінал… Дайшло да таго, што каратастрыжаныя лавілі даўгавалосых і нажніцамі абразалі ім хаер. На адной з такіх аперацый нават забілі нажніцамі даўгавалосага. Здарылася тое на вуліцы Энгельса, каля кінатэатра «Навіны дня», прынамсі, мне так расказвалі. Каля таго ж кінатэатра нават прайшла стыхійная дэманстрацыя мінскіх хіпі. Праўда, для мастакоў рабілі выключэнне, ім дазвалялі насіць доўгія валасы: мастак — вольная прафесія, пэўна, апошняя ў свеце. Толькі і на мастака можа знайсціся цэрбер. Так мастака з мянушкай Гвардзеец выкінулі са школы-інтэрната для адораных дзяцей за тое, што пафарбаваў валасы ў фіялетавы колер. Хлопцу не далі скончыць мастацкую школу, не далі атрымаць вышэйшую адукацыю за колер валасоў.

### Фердынанд і палова цагліны

Ёсць і ў Мінску дзівакі, што апранаюцца з выклікам. Фердынанд апранаўся так, нібыта ён аўстрыйскі прынц на паляванні. Вядома, не ўсё атрымлівалася ў Фердынанда, бо сродкаў не ставала, а працаваць ён не мог праз хваробу: раз на год даводзілася класціся ў «Навінкі» да доктара Круглянскага. Доктар прасіў мяне, каб я прынагодна акуратна нагадваў хвораму пра ягоны цяжкі стан, нагадваў пра патрэбу сустрэч з доктарам Круглянскім, я і нагадваў, бо ёсць просьбы, якія варта выканаць. Дапамога хвораму — святы абавязак не толькі ў дактароў. Шкада, не ўсе тое разумеюць. Не разумелі гэта і п'янтосы, суседзі Фердынанда. Яны кпілі з яго, абражалі і здзекліва рагаталі, ажно пакуль не атрымалі па падрыльніках і хрыбетніках. Фердынанд паклаў у сумку ад процівагазу палову цагліны і пацяжэлай сумкай адмудохаў крыўдзіцеляў. Фердынанда закрылі ў турму для вар'ятаў, маўляў — небяспечны для грамадства. Шкада, што доктар Круглянскі памёр і не змог дапамагчы свайму пацыенту ўратавацца ад турмы.

### Рудко і фінка

Рудко з'явіўся ў нас у сёмым класе. Вярнуўся з калоніі і сеў за апошнюю парту. Ён быў старэйшым на тры гады. Чаму яго накіравалі ў сёмы? Ніхто не цікавіўся. Ніхто не пытаўся, чаму за маўчанне і такую-сякую прысутнасць Рудко атрымлівае траякі, і яго спакойна пераводзяць з сёмага ў восьмы клас. На сваёй апошняй парце больш за тры ўрокі запар Рудко не вытрымліваў і сыходзіў. Прагуламі яго папракалі толькі тады, калі ён закахаўся і тыдзень праляжаў у ложку з каханкай. Класная хадзіла да Рудко дамоў. Ён цалкам голы адчыніў дзверы, а на ложку ляжала цалкам голая дзяўчына. Класная не стала нешта казаць пра аголенасць каханкаў, а проста нагадала пра магчымае вяртанне ў калонію. Больш Рудко не сыходзіў у доўгатэрміновыя загулы. Сядзеў сабе на ўроках і любаваўся сваім тварам у шырокім лязе вялікай фінкі. Пасля восьмага палова нашых аднакласнікаў разбеглася ў розныя бакі. Рудко пайшоў працаваць шафёрам на галоўпаштамт. Там я і сустрэў яго, Рудко сказаў, што ажаніўся і ў турму не збіраецца вяртацца… А хто ў турму збіраецца вяртацца? Вось і пагаварылі.

### Яроха-вялікі і гвалт

Тры Ярохі жылі ў суседнім пад'ездзе. Мы іх называлі: Яроха-стары, Яроха-вялікі і Яроха-малы. Яроха-стары — бацька вялікага і малога — працаваў газетным начальнікам, можна сказаць, лічыўся найгалоўнейшым газетнікам сярод тутэйшых журналістаў. Яроха-малы добра вучыўся, хадзіў па школе ў выдатніках. Яроха-вялікі вылучаўся ў сям'і ў дрэнны бок. Пасля заканчэння школы ён з сябрукамі паехаў у піянерскі летнік, дзе яны панапіваліся і згвалцілі дзяўчынку. Яроха-вялікі за ўдзел у групавусе з гвалтам адсядзеў дзесяць гадоў. Я не бачыў гвалтаўніка гадоў сорак, таму ён і не пазнаў мяне. Яроха-вялікі спыніўся на вуліцы, бо я гутарыў з журналістам Навумам па-беларуску. Навум казаў, што запросіць на інтэрв'ю, я казаў, што абавязкова падрыхтуюся і завітаю. Такія сабе абяцанкі-цацанкі, а тут з'яўляецца Яроха-вялікі і кажа, што яму прыемна пачуць на вуліцы нашу беларускую мову. Навум пачаў казаць, што мы заўсёды гаворым па-беларуску. Добра, што Навум даў мне магчымасць крыху падумаць і не паслаць Яроху-вялікага куды далёка. Непрыемна, калі тваю культуру і мову хваляць людзі кшталту Ярохі-вялікага. Непрыемна і брыдка, але ж лепей не сварыцца, супакоіцца і памаўчаць.

## Сяргей УКРАІНКА

***

*Прасую набожнік мамін:*
*паганскае сонца на белым*
*(васьмінітовы абрус!)...*
*Ты думала: Нехта явіць.*
*Ты ведала: Нехта правіць.*
*Ты бачыла: Нехта навіць.*
*Скажы мне нарэшце:*
*ён — хто?..*

***

*Дубцом дубовенькім,*
*дубцом выганяю сваю маладосць.*
*А яе не прагнаць жа, бедную:*
*Над возерцам маім*
*вечаруе,*
*як ні ноч — мае сны падпільноўвае,*
*і ўсё шэпча мне (прыхаджанцу!)*
*пра вечнае.*

***

*Вылічыўшы працягласць імгнення,*
*ха́пнуўся за валасы...*
*Час, пачакай, калі ласка!*

***

*Сказала суцешным голасам:*
*«Маўчы, я табе ўжо не жонка.*
*Ды нават ужо і не сябар.*
*Я — твой нявечны анёл».*

***

*Камень.*
*Каса.*
*Мянташка —*
*наша з табою жыццё?*

***

*...Надзея выжыць спачыла ў бозе,*
*калі, падобна глухой сцяне,*
*усе тапельцы Святога возера*
*пасталі кругам вакол мяне.*

*Сутонне рэдзілі ўсцяж зарніцы.*
*Сіпелі гады ў гнілых лаўжах.*
*А я, самлелы, глядзеў дурніцаю*
*на ўцеляснёны ў пачварах жах.*

*Ды ўсё ж ачуцца было мне суджана*
*расяным досвіткам. На траве.*
*З дзявочым голасам, што прастуджана*
*хрыпеў у хворай маёй галаве:*

*«Ты ж чуеш, дзядзька, мяне, вядома,*
*хоць розум твой і блукае дзесь.*
*Хай у змарнелай тваёй свядомасці*
*Умолле гэта не прападзе.*

*Ніхто не быў з нас раднёю Каіна —*
*не вінаватыя мы ні ў чым,*
*а толькі возера не адпускае нас,*
*хоць і завецца яно Святым.*

*Каб душы нашы знайшлі дарожачку*
*ці ў рай, ці ў пекла — Яму відней, —*
*ты памаліся за нас, нябожачкаў.*
*Ты памаліся. Хаця б у сне».*

***

*Марыў пра Монтэ-Карла,*
*а жыву ў Монтэ-Крыста*
*і вязніцу прымаю з будзённай пакорай,*
*бо душа, перацятая дротам сталістым,*
*патанула ў смузе*
*Герадотава мора.*

*Стыць бяздушным цяжэй,*
*чымся тлець бездухоўным —*
*той прывык абыходзіцца*
*чаркай ды шкваркай.*
*А вось бачыш, і мне*
*стала ўрэшце ўсё роўна,*
*хто сядзіць на плячы —*
*ці анёл, ці пачварка.*

***

*Горад цярплівы*
*з душою самотнай жанчыны,*
*ты хоць пасмейся нарэшце з хлапца-дзівака:*
*ён жа цябе называе*
*«заўсёднай прычынаю»*
*бедаў,*
*якія ў няпростым жыцці напаткаў.*

*Ты выбачай,*
*што цікаўным расказвае з гонарам*
*казку*
*пра лёгкае шчасце ў «чужой» старане:*
*быццам не ён пераехаў на ціхую ўскраіну*
*горада,*
*а Магілёў адступіў,*
*бо не змог перасіліць...*
*(мяне).*

***

*Учора галава мая сівая*
*у адначассе парусела зноў.*
*Не ведаў я раней, што так бывае,*
*хаця свет ясна-белы абжываю*
*даволі доўга — шэсцьдзясят гадоў.*
*Ніхто з найблізкіх не ўздыхнуў у скрусе,*
*што я дасніў нарэшце кляты сон...*
*Убачыўшы крыжы над Беларуссю,*
*я, жахам набрынялы, не прачнуўся.*
*Затое стаў русявы, нібы лён.*



Фота shutterstock.com

## Уладзімір ВАСЬКО

### Дуб

*Задумаўся дуб над ракою*
*аб свеце вялікім і вечным,*
*махае аблокам рукою*
*і марыць, і марыць аб нечым.*
*Магутны ён і прывабны,*
*памклівы з буслами*
*братацца.*
*Не нам разгадаць*
*яго тайны,*
*не нам з ім, высокім,*
*раўняцца.*
*Нічога ён не баіцца:*
*ні бураў налётных,*
*ні комы.*
*Пад ім векавая крыніца*
*бруіцца, бруіцца без стомы.*

***

*Уціснуты — у гушчыню падзей, —*
*спыняю ўвагу на станоўчым.*
*А на душу адмоўнае кладзе*
*нядобры позірк, позірк воўчы.*
*Прыемна, як узводзяцца дамы*
*і людзі ад кватэр*
*ключы прымаюць,*
*як выплаўляюць золата з руды*
*і залаты запас*
*народы маюць.*
*Але настрой адразу*
*ўніз паўзе,*
*калі паказваюць сляды аварый,*
*як гойсаюць пажары па тайзе,*
*як крываточаць*
*ад раненняў твары.*
*Ва ўражаннях таксама*
*сіла ёсць:*
*калі адмоўным*
*капаць на свядомасць,*
*дык чалавек — у гэтым свеце госць —*
*прап'е ўсе грошы*
*ды і ўсю маёмасць.*

***

*У раніцу ўскочыла ты*
*з кватэры, што суму не мае,*
*і ног тваіх лёгкі матыў*
*гучыць, нібы музыка мая.*
*Абцасікі — тук, тук, тук, тук —*
*наўсцяж разганяюць скруху.*
*Эх, каб сплёў мне сетку павук —*
*я злавіў бы цябе, як муху!*

### Жураўлінае расстанне

*Ціхі гарадок*
*заснуў у даліне.*
*Поўнач. Залатая цішыня.*
*А высока ў жураўліным*
*кліне*
*пераклічкі птушак*
*не суняць.*
*Бедныя, куды яны*
*ляцяць уночы?*
*Іх не бачна*
*ў зоркавым святле.*
*Ды важак ім*
*не дазволіць збочыць,*
*у далёкі поўдзень*
*пазыўныя шле.*
*Я іду ад любай*
*са спаткання.*
*Ліхтары мой*
*асвятляюць шлях.*
*Жураўліным з ёй*
*было расстанне,*
*хоць курлыкай тут*
*на ўвесь абсяг.*
*Памахаў рукой*
*адлётным птушкам,*
*папрасіў вярнуцца*
*іх назад.*
*Буду чуць іх крыкі*
*над падушкай*
*доўга-доўга,*
*можа, да каляд.*

### Уражанні

*Не спатоліць прагу*
*да ўражанняў:*
*шару позіркам*
*па небе і зямлі,*
*па дубах, што не абняць*
*і сажнямі,*
*па натоўпах*
*стройненькіх ялін,*
*па бярозах белых,*
*па мурашніку,*
*па вавёрцы,*
*з выгнутым хвастом,*
*па прыгожым*
*і настырным дзятліку,*
*па клубку калючым*
*пад кустом.*
*Калі ў Лідзе — па дзяўчатах*
*вабненькіх,*
*па машынах,*
*што наводзяць страх,*
*па дамах і магазінах*
*файненькіх,*
*па катах рухавых у дварах.*
*Нахапаю ўражанняў*
*даліха я,*
*што не ўмесціць*
*памяці мяшкі,*
*а наступіць плаўна*
*ночка ціхая —*
*заганю я іх*
*усе ў радкі.*

## Язэп ПАЛУБЯТКА

***

*Адзінота*
*У гарадской мітусні,*
*Дзе мора хлусні.*

*Адзінота,*
*Як сам з сабою раішся,*
*Бывае мірышся, бывае сварышся.*

***

*Вечнасць —*
*Яна як дарога,*
*Ад парога і да парога.*

*Вечнасць*
*Складаецца з жыцця твайго і майго,*
*Сонца, расінкі, хмаркі, з усяго.*

*Вечнасць,*
*Што наўкола, —*
*Быцця неразрыўнае кола.*

***

*Імгненне.*
*Яно тое, што прыйшло і сышло,*
*Адкрасавала і адцвіло.*

*Імгненне.*
*Зорка, што сіганула з неба,*
*Увесну — цёплая, пульхная глеба.*

*Імгненне.*
*Твой час на зямлі —*
*Крыгі ўвесну, што па рэчцы сплылі.*

***

*Цішыня*
*Гнятучая перад боем,*
*Пасля якога салдат хоча спакою.*

*Цішыня,*
*Калі сэрца каханай чуеш: тах-тах,*
*І тваё адказвае ў такт.*

***

*Скрыжаванне,*
*Затрымайся, падумай: куды табе*
*йсці далей?*
*Ісці, каб было прасцей.*

*Скрыжаванне,*
*Нехта цябе прыдумаў не дарма,*
*Бо не хацеў даваць кругаля.*

*Скрыжаванне.*
*О, колькі вас на ўсёй зямлі,*
*Куды б мы толькі ні пайшлі.*

***

*Твае вочы.*
*Чорнай ноччу яны мне свяціліся.*
*На святло іх ішоў і маліўся,*
*каб не стуліліся.*

*Твае вочы.*
*Гэта душы тваёй полымя зыркае.*
*Шчырасць іх не змераць*
*ніякаю меркаю.*

*Твае вочы.*
*Бясконцасць нябёсаў высокіх,*
*Святло непагасных зорак далёкіх.*

***

*Позняе тэлефанаванне.*
*Ты ўжо забылася мяне даўно.*
*Восень.*
*Дождж з ветрам рвуцца ў акно.*

*Позняе тэлефанаванне.*
*Зумер выбухам паўстаў у начной цішы.*
*Так і хочацца крыкнуць:*
*мінулае не варушы!*

*Позняе тэлефанаванне.*
*Не ведаю, што ў цябе на душы.*
*Голас знаёмы: «Я памылілася...»*
*апошнюю іскру пачуццяў тушыў...*

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (243), лістапад 2026 года

# След саламандры

## Казка не толькі для дарослых



Ірына ХАДАРЭНКА

***

Сонечныя блікі здзяйснялі свой неймаверны парад па шкляных паверхнях вокнаў хмарачосаў. Калі б не сістэма цэнтралізаванага кандыцыянавання, што стварала прыемную прахалоду, цела магло б ператварыцца ў яечню, а мозг — у павялічанае падабенства грэцкага арэха без цвёрдай абалонкі.

Мацей напружана сядзеў у офісным фатэлі, бесперапынна дрыгаючы левай нагой і сціскаючы шклянку віскі ў руцэ, як тапелец саломінку. Дванаццаць гадоў ён упарта і рупліва будаваў сваю маленькую імперыю, якая аказалася на мяжы зруйнавання. Паспяховы бізнэс у выглядзе страхавой кампаніі, надзейны сямейны тыл і нават папярэднія дасягненні ў спорце — усё гэта раптам стала хісткім, крохкім і гатовым у любы момант разваліцца на кавалкі.

Ён замружыў вочы і прымроіў апошні хакейны матч, у якім браў удзел. Як імкліва ён ляціць наперад з клюшкай, рашуча адштурхоўваючы супернікаў і філігранна выпісваючы ўзоры на лёдзе лязом сваіх канькоў. Але стоп… гэта што яшчэ такое?.. Знянацку хакейная брама некуды знікае, а замест яе ўтвараецца бяздонная чорная дзірка. Мацей рэзка падварочвае нагу, валіцца на лёд і на момант губляе прытомнасць. З цяжкасцю ўзняўшыся, ён усведамляе, што шайбу адабралі супернікі, і перавага цяпер на іхнім баку. Які сорам! Як ён мог гэтак недарэчна падвесці каманду, а галоўнае — з якой нагоды! Што з ім наогул здарылася?..

У дзверы кабінета ціхенька пагрукалі. «Да Вас наведвальнік», — пачуў ён мілагучны голас сакратаркі, якая прасунула кучаравую галаву ў дзвярны праём. — «Ці магу я запрасіць спадара Уладзіміра?» Мацей моўчкі кіўнуў галавой і паставіў шклянку на столік.

Стары сябра звычайна ўрываўся ў супольную прастору няўрымсліва, як цыганскі дождж.

— Гэй, здарова, браце! — грымнуў ён з парога. — А твая сакратарка — тая яшчэ штучка, я б з ёй замуціў, — паведаміў ён, пасміхаючыся.

Мацей марудна ўзняўся з фатэля, працягваючы руку.

— Як твае вакацыі? Мяркуючы па выглядзе, выдатна, — з лёгкім адценнем зайздрасці прамовіў ён.

— Ой, і не кажы, — пацвердзіў Уладзімір. — Вакацыі на ўсе сто, ці мо нават на сто дваццаць! За́мкі і пячоры, горы і мора, добрая кухня, а галоўнае — нядорага.

— Куды ты ездзіў гэтым разам? Нагадай, калі ласка.

— На радзіму графа Дракулы, у Румынію. Дарэчы, вось табе тамтэйшы сувенір, — Уладзімір выцягнуў з партфеля падсвечнік у выглядзе невялічкай керамічнай фігуркі і гучна паставіў яго на столік.

— Што гэта?

— Саламандра — сімвал духоўнай трансфармацыі і дабрабыту. Выраб мясцовага майстра. Кажуць, у Беларусі таксама даўным-даўно вадзіліся гэтыя рэптыліі, прычым гіганцкія, і нашыя продкі трымалі іх у якасці хатніх жывёл. А потым з-за неспрыяльных умоў яны эміграваліі, як мы з табой… Але ты лепш пра сябе распавядзі, бо даўным-даўно не бачыліся, — сябрагеданіст нецярпліва круціўся ў фатэлі.

— Ай, — адмахнуўся Мацей. — Бывала лепей. Столькі ўсяго навалілася, што нават і не ведаю, як даць рады.

— Ну давай, не маўчы. Няма такіх праблем, якія немагчыма было б вырашыць.

— Мне б хоць крыху твайго аптымізму, дружа, — Мацей рэзка дапіў віскі, кіўком прапануючы сябру зрабіць тое ж самае.

— Не, дзякуй, я насамрэч цяпер рэдка да кілішка дакранаюся. У маладосці мог залівацца, як чорт, а цяперака неабходна дбаць пра здароўе. Бо сам жа ведаеш: алкаголь нас забівае. А я збіраюся жыць доўга.

— Я б таксама хацеў, — уздыхнуў Мацей. — Але апошнім часам не бачу, дзеля чаго і навошта.

— Э-э, ды ты нейкі дэпрэсіўны, Мацею, — суразмоўца пазіраў на яго са спачуваннем. — Не пазнаю цябе. Заўсёды ў нашай кампаніі ты завадатарам быў, а сёння выглядаеш, як здуты балонік. Зрэшты, не такі ўжо і здуты — бруха тваё трохі расце, як у цяжарнай кабеты.

І Уладзімір зарагатаў, адкінуўшыся на спінку фатэля.

Мацей надзьмуў бровы:

— Праблемы ў мяне, Валодзя. І сур'ёзныя. Таму і п'ю, каб крыху расслабіцца.

— Вось табе і на!.. Што ж такога асаблівага здарылася за той год, што мы не бачыліся? З бізнэсам нешта? Ты кажы, не саромейся, я дапамагу, чым змагу. Мы ж з табой амаль як браты — з юнацтва адзін аднаго ведаем.

— З бізнэсам — гэта яшчэ палова бяды, — неахвотна распачаў Мацей. — У дваіх кліентаў узніклі страхавыя выпадкі з вялікімі сумамі кампенсацый. Мы спрабавалі адхіліць прэтэнзіі, але тыя пайшлі праз суд. І ў фірмы такія запазычанасці, што адвакаты раяць запусціць працэс банкруцтва. А пазней, калі ўсё ўладкуецца, адкрыць новую фірму.

— І правільна раяць. Ты ведаеш, колькі разоў я банкруціўся са сваёй будаўнічай кампаніяй? Тройчы. І з мяне як з гуся вада. Так што гэта дакладна не катастрофа. Перажывеш, а потым яшчэ і смяяцца з усяго гэтага будзеш.

— Не ўсё так проста, — уздыхнуў Мацей. — Памятаеш Юлю, жонку маю?

— Ну вядома. Што з ёй не так? Мазгі выносіць?

— Калі б толькі гэтае. Па-першае, фармальна яна саўладальніца фірмы. Па-другое, дзевяць месяцаў таму яна падала на развод і патрабуе палову ўсёй маёмасці, у якую сама ніколі ні цэнта не ўклала, плюс поўную апеку над сынам. І тут ужо мае адвакаты кажуць, што ў мяне шанцаў мала. А на мне яшчэ й іпатэка вісіць.

— Вось яно што, значыць! От жа лярва! Вось чаму я ніколі не ажанюся, хоць і маю дваіх дзяцей. Свабода даражэй за ўсё!

— Была ж нармальная жанчына некалі. Але ў апошнія тры гады яе быццам падмянілі. Пазнаёмілася тут з якімісьці шлёндрамі і пачала па рэтрытах ездзіць. Кажа, што я праяўляю ў дачыненні да яе аб'юз і газлайтынг. І нібыта мая энергетыка шкодна ўздзейнічае на сына. Дарэчы, сваю працу ў салоне яна даўно кінула. Цяпер Юля — не абы хто, а тантрычная кундаліні-фасілітатарка і майстарка рэйкі…

— Хто??? Гэта што за лухта такая? Зусім звар'яцела баба, — у вачах Уладзіміра бліснула маланка. — І я ведаю, чаму. Зашмат ты ёй дазваляў. Хоча Юленька тое — ты купляеш. Хоча сёе — калі ласка. Вось яна і разбэсцілася. А трэба было драць, як сідараву казу, і днём, і ноччу.

— Халера з ёй. У нас даўно ўжо стасункі сапсаваліся. Але ж яна мяне да сына не дапускае. Чатыры месяцы яго не бачыў, — голас Мацея задрыжэў.




— Ё-маё, ну гэта сапраўды справы дрэнь, — твар Уладзіміра спахмурнеў, а рука пацягнулася да бутэлькі з мінералкай.

У паветры павіс нябачны саламяны павук панурага маўчання. Толькі трэлі няспынных тэлефанаванняў у суседнім пакоі раз-пораз праціналі прастору.

— А ведаеш, што? — Уладзімір нечакана ўзняўся з фатэля і наблізіўся да вакна. — Можа, табе самому патрэбна з'ездзіць на рэтрыт? У аднаго майго знаёмага амерыканца была падобная сітуацыя ў сям'і, дык ён пасля таго рэтрыту блішчэў з выгляду, як вунь той хмарачос. І праблемы з жонкай павырашаў настолькі ўдала, што яна нават разводзіцца перадумала. Больш за тое — яны цяпер разам па тых рэтрытах бадзяюцца. А нядаўна кудысьці ў амазонскія джунглі пацягнуліся. Во як бывае… Так, пачакай, ён мне пакідаў візітоўку канторы, што тыя вандроўкі ладзіць. Толькі гэта не ў ЗША, трэба будзе за мяжу ехаць.

— Куды менавіта? — ляніва спытаў Мацей, не дэманструючы асаблівага энтузіязму.

— Здаецца, першы заезд у яго быў у Беліз. Я ўжо не памятаю дакладна. Джэк такі балбатлівы, гаманіў хвілін сорак, але я так і не зразумеў, што ён дакладна на тым рэтрыце рабіў. Казаў, адбывалася ўсё на бязлюднай акіянскай выспе з шаманам, і нейкі дон Пэдра са сваім магічным напоем да такой ступені змяніў ягонае жыццё, што яно ніколі ўжо не будзе ранейшым. І што тыя пяць тысяч даляраў, якія ён заплаціў за паездку, — гэта вельмі танна ў параўнанні з атрыманым досведам. А, во, знайшоў картку. На вось, трымай, мо спатрэбіцца…

Мацей скептычна зірнуў на кавалак картонкі з надпісам «Karma Inc.», упрыгожаны дзіўнымі геаметрычнымі фігурамі. Пяць тысяч. Вядома, гэта дробязь у параўнанні з тымі пяцістa тысячамі, якія ён можа страціць у бліжэйшы час. <…>

***

«І чаго я цягнуся немаведама куды? Хіба захацелася, як у дзяцінстве, паверыць у казку? — казаў ён самому сабе, часова адключаючы тэлефон. — Зрэшты, гэта ўсяго толькі на некалькі дзён. У панядзелак днём вярнуся. Горш, чым ёсць, дакладна не стане».

Па прылёце Мацея сустрэў нізкарослы смуглявы хлопец з таблічкай з ягоным імем.

— Мяне зваць Ісус, — прадставіўся ён. І прачытаўшы выразнае здзіўленне на твары госця, дадаў: — Проста я нарадзіўся дваццаць чацвертага снежня, таму маці вырашыла так назваць. Хоць мы і каталікі, але большасць маіх продкаў паходзяць са старажытнага племені майя. Я завязу Вас у гатэль. Ваш пераезд на выспу запланаваны на паслязаўтра. А заўтра, калі жадаеце, магу звазіць да пірамід, бо ў Беліз-Сіці глядзець асабліва няма чаго. Гэта зойме гадзін сем-восем, выезд а дзявятай раніцы.

— Дамовіліся, — без доўгіх разваг пагадзіўся суразмоўца.

Ранкам, атрымаўшы даволі сціплы сняданак і ўзгадаўшы пра тое, што за дзень да так званай цырымоніі глыбокага ачышчэння неабходна прытрымлівацца адмысловай дыеты, Мацей выйшаў з гатэля, паблізу якога ўжо чакаў учарашні знаёмы, і дзяжурна спытаў у таго:

— Куды мы дакладна скіроўваемся?

— Паедзем у мястэчка Шунантуніч, што на мяжы з Гватэмалай, — адказаў кіроўца, прымацоўваючы рамень.

— Чаму менавіта туды?

— Мае продкі адтуль. Тыя мясціны абжываліся прыкладна тысячу гадоў таму да нашай эры. І там знаходзіцца другая па велічыні піраміда ў Белізе. Назва мястэчка перакладаецца як «Каменная панна».

«Угу, амаль як мая жонка апошнім часам», — прамільгнула ў галаве ў Мацея.

— Легенда сцвярджае, што ў ваколіцах галоўнай піраміды часам можна пабачыць прывід жанчыны ў белым строі і з чырвонымі вачыма. Кажуць, гэта пакутніцкі дух, што не знайшоў спакою пасля ахвярапрынашэння, — працягваў аповед нашчадак майя.

«Прыкладна як у нашым Гальшанскім замку. Паўсюль адно і тое ж», — падумаў Мацей, адчуваючы сябе на школьнай экскурсіі. <…>

Наступным ранкам Ісус уваскрос у ранішнім абшары з намерам завезці да парома ўчарашняга пасажыра. «А той шаман, што будзе на выспе, таксама з племені майя?» — пацікавіўся апошні ў кіроўцы. «Не, Пэдра належыць да народнасці гарыфуна. Але сваю справу добра ведае, не хвалюйцеся», — запэўніў той.

Дзве гадзіны на матарызаваным чоўне, што смела рассякаў марскія хвалі, праляцелі незаўважна. Сыйшоўшы на бераг, Мацей адчуў сябе Рабінзонам у раі: пальмы, гамакі, чысцюткі пясок на пляжнай лініі і туркусовы колер вады. А галоўнае — ніякага тлуму і людзей наогул не відаць, апрача некалькіх прадстаўнікоў персанала.

«Вітаю, маё імя Пабла. Цырымонія пачнецца ўвечары, дон Пэдра ўжо рыхтуецца, — паведаміў яму мясцовы адміністратар, добразычліва працягваючы какос з трубачкай. — А пакуль што адпачывайце». «Гэты Пабла, той Пэдра. Апосталы…» — падумаў Мацей.

Калі ж сонца пачало хіліцца да вады, ён нарэшце быў прадстаўлены цемнаскураму чалавеку з цяжка вызначальным па выглядзе ўзростам, незнаёмец быў апрануты ў доўгую каляровую туніку. Шаман, або як яго звалі па-мясцоваму, — буіе Пэдра, — меў дрэды, што выбіваліся з-пад белага цюрбана, а на ягонай шыі боўталася ўпрыгожванне з ракавак ды іклаў дробных жывёл. Уважліва агледзеўшы Мацея з галавы да ног, ён перакінуў вялікую торбу на другое плячо і жэстам паказаў ісці за ім углыб востраваа. Нарэшце яны ўдваіх спыніліся на паляне, дзе паміж дзвюмя пальмамі быў нацягнуты гамак, а на зямлі праглядалася некалькі кавалкаў дрэва, прыстасаваных для сядзення вакол рэштак кастрышча.

Сутонне насоўвалася вельмі імкліва. Пэдра выцягнуў з торбы драўляны барабан, самацканы кілім, шэраг ёмістасцяў з рэчывамі, задаволена хмыкнуў і, нечакана ўключыўшы на тэлефоне песню Джыма Морысана «Распалі мой агонь», заняўся развядзеннем вогнішча. Потым, загадаўшы Мацею стаць побач, падкінуў у полымя зёлкі і, няспынна мармычучы сабе нешта пад нос… Аднак філіял пекла пачаў адчыняцца перад Мацеем пазней — пасля таго, як Пэдра разагрэў у кацялку залітую туды з бутэлькі вадкасць цёмна-бурштынавага колеру, пераліў яе ў конаўку і запатрабаваў выпіць усё спакваля, дробнымі глыткамі.

Больш агіднага па смаку напою Мацею ў сваім жыцці паспытаць не даводзілася. Ягоная глотка нібы ператварылася ў гарлавіну аўтамабільнага бака, у якую паволі залівалі паліва. Ён хацеў было спыніцца і глытнуць вады замест гэтай брыдоты, каб хоць крыху перабіць гаркату ў роце, але Пэдра быў няўхільны, таму хоцькі-няхоцькі, але прыйшлося дапіць невядомую баланду. Потым шаман выцягнуў з торбы, што падавалася беспамернай, тонкую коўдру з арнаментам, накінуў Мацею на плечы і дапамог яму пакласціся ў гамак. «Заставайся тут і чакай, — прамовіў ён. — Духі ўжо набліжаюцца і нясуць табе ачышчэнне». Пасля чаго вярнуўся да вогнішча, прысеў на адзін з карчоў і пачаў люта лупцаваць па сваім барабане.

**Заканчэнне на стар. 7 »**

# След саламандры

## Казка не толькі для дарослых

**« Заканчэнне. Пачатак на стар. 6**



Найперш да Мацея прыйшло адчуванне, што з немаведамых глыбінь высунуліся брыдкія халодныя шчупальцы і няўмоўльна зацягваюць яго ўніз разам з гамаком. Ён паспрабаваў, ледзьве варушачы языком, паклікаць Пэдра, але той знітаваўся з барабанным рытмам настолькі, што не зважаў на ўсё астатняе. «Як я мог пагадзіцца на такую дурноту? — дакараў сам сябе Мацей. — А раптам я тут памру, наўпрост на гэтай выспе. Што тады?»

Аднак паглыбіцца ў экзістэнцыяльныя развагі яму не дазволіла раптоўна ўзніклая цяга да ванітаў. Усведамляючы, што ён не паспее ўзняцца з гамака, Мацей проста звесіў галаву ўбок і сутаргава выплеснуў вонкі частку спажытай атруты. І толькі пасля гэтага змікціў, навошта шаман даў яму коўдру — нягледзячы на вельмі цёплае надвор'е, яго пачало калаціць ад холаду. Узняцца з гамака аказалася няпроста: цела зрабілася ватным і ніяк не хацела яго слухацца. Падрыгаўшыся аслабелай мухай у павуцінні, ён нарэшце перакуліўся на зямлю і, цяжка дыхаючы, папоўз у супрацьлеглым ад вогнішча кірунку.

Падскочыць на ногі яго прымусіў падступны прыступ бягункі. Нярвова азіраючыся, Мацей спрабаваў угледзець навокал хоць якія кусты ці шырокае дрэва, але паблізу праглядалася толькі крывая адасобленая пальма, да якой было метраў сто. Гэтую дыстанцыю ён пераадольваў цяжэй за самы складаны з сыграных ім за ўсё жыццё матчаў. Падхапіўшы сухую пальмавую галіну ў якасці клюшкі, што надала яму моцы, ён упэўнена рушыў да дрэва, якое чамусьці здалося хакейнай брамай. Нарэшце аблягчыўшы страўнік, ён абаперся на пальмавы ствол правай рукой, спрабуючы перавесці дых у суцэльным змроку.

Узняўшы галаву ўверх, Мацей глядзеў у бясконцае зорнае неба і жадаў патрапіць у машыну часу, якая б перанесла яго ў дзяцінства, падалей ад усіх праблем і ад таго страшэннага стану, у якім ён апынуўся. Перавёўшы позірк на пальмавы ствол, ён на момант здранцвеў, заўважыўшы, што частка ствала пачала варушыцца, адасабляцца, пакуль не праявілася ў выглядзе досыць вялікай цёмнай яшчаркі. На шыі ў рэптыліі раздзімаўся чырвоны каўнер кшталту жабо, і яна незадаволена гаркнула, спаўзаючы з пальмы: «Яшчэ адзін прыхадзень. Панаехалі тут!»

Ад здзіўлення на ілбе Мацея выступіў халодны пот. Тым часам яшчарка, працягваючы абурацца, уселася на пясок побач з пальмай і пачала расці, пакуль не ператварылася ў гіганцкага памеру саламандру. Мацей ушчыкнуў сябе двойчы — істота не знікала. Тады ён адчайна ўпаў на зямлю, закрыў галаву рукамі, быццам спрабуючы абараніцца ад непазбежнага, і праляжаў так, пакуль не ўсвядоміў, што грукату барабана і голасу Пэдра болей не чуваць. Ён прыўзняўся на калені, расплюшчыў вочы і… пабачыў усё тую ж саламандру, у якой, аднак, цяперака меліся акуляры і… — во дзе сапраўдная вусціш! — твар ягонай настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Зоі Станіславаўны.

***

— Ну што, Мацей-грамацей, ты выканаў хатняе заданне? — спытала яна, сурова паблісквaючы зрэнкамі праз акуляры. — Ці хочаш, каб я пакінула цябе тут на другі год?

«Божухна, што ж гэта робіцца?» — ён разгублена мітусіўся па пяску, спадзеючыся на абуджэнне ад недарэчнага сну, які павінен хутка скончыцца.

— Адказвай, я цябе пытаюся! — патрабавальна сказала пані Зося, папраўляючы чырвонае жабо. Усім вучням было вядома пра ейны зоб, які яна любіла маскіраваць або шалікамі, або высокімі каўнярамі, або яшчэ чымсьці.

— Н-не-е, я забыў, — спалохана прашаптаў ён.

— Ха, забыў ён! — рэптылоідны твар наблізіўся да яго з намерам, уласцівым вялікім інквізітарам. — А галаву ты дома не забыў?! А прагульваць урокі і гойсаць з такімі ж лайдакамі на стадыёне не забыў?!

— Дапамажыце! — паспрабаваў крыкнуць Мацей асіплым голасам.

Саламандру ў акулярах гэты пакутніцкі енк развесяліў, і яна зарагатала, скаланаючыся ўсім тулавам:

— Ніхто тутака не дасць табе спісаць! Скончылася маліна, цяпер ты сам адказны за сваё жыццё.

— Прабачце, — разгублена прашамкаў ён, — у мяне страшна́я галаўна́я боль…

— Боль — мужчынскага роду ў беларускай мове, доўбень ты гэткі! Таму не страшнаЯ, а страшнЫ, — раз'юшылася рэптылія, ляснуўшы яго па карку нечым халодным і ліпкім.

— Даруйце, шаноўная Зоя Станіславаўна, толькі не бейце. Спіна таксама баліць. Наогул, біць дзяцей непедагагічна…

— Не бейце, а ня біце! — пані Зося зласліва прымружыла вочы. — Колькі разоў вам паўтараць?! Да таго ж, дзе ты бачыў тут дзяцей? Паглядзі на сябе, небарака, у цябе ўжо валасы сівыя прабіваюцца ды бруха звісае. А родную мову і дагэтуль не засвоіў. Ганьба!

Скеміўшы, што ён не спіць, а знаходзіцца ў якойсьці перакуленай рэчаіснасці, Мацей паспрабаваў адпаўзці далей за пальму.

— Куды сабраўся, боўдзіла?! — істота схапіла яго за нагу і вярнула на месца. — Урок яшчэ не скончаны. Распавядзі мне, як ты сюды патрапіў.

Мацей адчуў гатоўнасць пасыпаць галаву попелам. Але навокал быў толькі пясок. Змагаючыся з абязвожваннем, ён стомлена выдыхнуў:

— Мой сябра, у якога бізнэс, звязаны са стройкай… пасаветаваў… Ну вось я і….

— Якой стройкай, калі правільна — будоўляй! І не пасаветаваў, а параіў! Краіна Саветаў, каб яе ліха!.. Ух, як жа вы ўсе дапяклі мяне з мярзотнай трасянкай! — на тулаве саламандры бліснулі вогненныя плямы. — Нашыя класікі, мабыць, у труне варочаюцца ад усяго гэтага. Дарэчы, ты хоць які верш з мноства тых, што мы вучылі напамяць, можаш узгадаць? А ну, адказвай, абібок! А інакш — табе халэмус!

Адчуваючы, што ягоны мозг зараз узарвецца ад напружання, Мацей усё ж такі здолеў закінуць вуду на дно возера сваёй расхістанай свядомасці і выцягнуў наступнае:

*Цвёрда трымаўся юнак на дапросе,*
*Тоячы словы і думкі свае.*
*Вораг-жандар дакурыў папяросу*
*І камсамольскі білет аддае.*
*— Вось і білет твой, — сказаў ён ласкава, —*
*І ад яго на вачах у людзей*
*Ты адцурайся; выгодная справа:*
*Жыць застанешся, — жыццё даражэй.*

Прамаўляючы слова «жыць», ён пачаў усхліпваць, разумеючы, што ніводны страхавы поліс у свеце не гарантуе яму станоўчага фінала ў гэткім незвычайным падарожжы.

— Ну хоць нешта здолеў успомніць — ужо выбітнае дасягненне, — лагодна пасміхнулася рэптылія. — Але з такім маўленнем і такой дыкцыяй, Мацей, цябе можна запрашаць хіба што галасіць на хаўтуры… Ладна, шкыньдзёхай адсюль, не псуй мне краявід сваім выглядам! — і чорная фігура ў акулярах паступова растварылася ў прасторы.

Мацей ачомаўся на золку. Падзеі наступных содняў пракруціліся перад ім, як кадры з дыяфільму. Шаман Пэдра схіліўся над ягоным тварам, дакранаючыся сваімі дрэдамі, праспяваў на манер Боба Марлі: «Усё будзе ў парадку, оў-е»; асістэнт Пабла перасунуў яго разам з рэчамі ў човен, а маўклівыя чарнявыя хлопцы, што выглядалі, як сапраўдныя піраты Карыбскага мора, давезлі да матэрыка; амаль бяссонная ноч у гатэлі, есці нічога не хацелася, толькі піць; Ісус у чарговы раз уваскрос з ніадкуль і дакінуў яго да аэрапорта; адзін памежнік абыякава ўляпіў штамп у ягоны пашпарт, нічога не пытаючыся; другі памежнік толькі ўзняў адно брыво і са словамі «З адпачынку? Што ж, сардэчна запрашаем дадому!» вярнуў дакумент; таксіст, пабачыўшы адрас, пачаў злавацца ад імавернай складанасці знайсці паркоўку; і толькі традыцыйны гук «дзыньк!», што заўсёды выдаваў ліфт, які спыніўся на дваццаць другім паверсе, вярнуў Мацея да паўсядзённасці.

Ён звыклым рухам адчыніў дзверы офіса. Вось знаёмыя тэчкі з паперамі і адсунуты ўбок кампутар, які трэба занесці ў гарантыйны рэмонт. Вось размаляваны чырвоным маркерам насценны каляндар і сметніца, запоўненая пластыкавымі кантэйнерамі і капсуламі з-пад кавы. Няўжо тое, што здарылася з ім падчас падарожжа, яму толькі прымроілася?

— Прывітанне, шэф, — радасна пасміхаючыся, патрасала кудзеркамі сакратарка. — У мяне для Вас дзве навіны.

— І абедзве кепскія? — дадаў ён, скідваючы каля стала торбу з заплечнікам.

— Чаму так адразу? Акурат наадварот — абедзве добрыя, — выраз твару сакратаркі ззяў так, нібы яна сыйшла з подыуму.

— Ну і якія ж, цікава? — засяроджана спытаў Мацей.

— Па-першае, тыя двое, што падавалі скаргу ў суд, адклікалі яе з-за адсутнасці поўнага спектру доказаў. Больш за тое, нашыя адвакаты нарылі, што гэта была спроба махлярства, ініцыяваная звонку. Іх спрабавалі падкупіць. Здагадваецеся, у каго быў доступ да ўнутранай інфармацыі і каму спатрэбілася такая махінацыя?

— Пачакай, яшчэ раз… Адклікалі скаргу?

— О, я бачу, Вы яшчэ не прызямліліся пасля пералёту. Так, адклікалі, справа закрытая. Літаральна сёння. Так што працуйма далей — і ніякага банкруцтва! Больш за тое, цяпер мы ў сваю чаргу маем падставы падаць на іх у суд.

— Хм… Цуд дый толькі! Ну а другая навіна якая?

— Такая, што хтосьці надзвычай важны чакае Вас у кабінеце.

— Але ж я не прызначаў ніякіх сустрэч на сёння!..

— Я падкрэсліваю: гэта надзвычай важны чалавек.

— Аўдытар з дэпартаменту або прадстаўнік падатковай інспекцыі?.. — жартаўлівы настрой сакратаркі відавочна не рэзаніраваў з ягоным самаадчуваннем.

— Здаецца, камусьці патрэбны адпачынак пасля адпачынку, — уздыхнула дзяўчына, адчыняючы дзверы ў ягоны кабінет.

Мацей пераступіў парог і ахнуў.

— Ігнат! Ты як тут апынуўся? — здзіўлена ўсклікнуў ён, падхопліваючы сына на рукі.

— Татуля, я так рады цябе бачыць! Я папрасіў старэйшага брата майго сябра Ніка прывезці мяне сюды. Сказаў, што гэта тэрмінова.

— А маці ты паведаміў? — Мацей не мог паверыць сваім вачам.

— Я пакінуў ёй цыдулку, дзе напісаў, што хачу жыць з табой. А потым збег з апошняга ўрока ў школе.

— От жа гарэза! Ты хаця ж паеў нешта?

— Так, я не галодны. Цёця з суседняга пакоя вельмі спагадлівая — яна пачаставала мяне яблычным пірагом і сокам!.. А ведаеш, дзе мы былі на мінулым тыдні з класам? Наша настаўніца вадзіла нас у заапарк, і мы там бачылі розных яшчарак! І вялікіх варáнаў! Яны такія дзівосныя! І надзвычай разумныя, мне нават здавалася, што яны могуць чытаць нашыя думкі…

У гэты момант Мацей пачуў гук уваходзячага паведамлення. Ягоная пакуль яшчэ жонка даслала смску: «Ты дзе??? Зараз жа адказвай. Ігнат не вярнуўся са школы. Калі ты яго выкраў — я напішу заяву ў паліцыю!» Мацей набраў на клавіятуры тэкст «Абанент быў завербаваны рэптылоідамі і часова недасяжны» і націснуў кнопку «Даслаць».

— Татка, а мы пойдзем з табой на хакей? Памятаеш, ты мне даўно абяцаў…

— Пойдзем, канешне. Адразу, як распачнецца сезон. Ты ж ведаеш, абяцанні заўсёды трэба выконваць.

— А паглядзі, што я для цябе намаляваў! — хлопчык дастаў са школьнага заплечніка аркуш з выявай лапкі з чатырма пальцамі. У кожны палец было ўпісана па слове, якія складаліся ў фразу: «Тата, я цябе люблю».

— Я таксама цябе вельмі люблю, сынок! — ён на хвіліну заплюшчыў вочы, а калі прыўзняў павекі, змахваючы скупую мужчынскую слязу, дык пабачыў, як керамічная фігурка саламандры, што стаяла на століку, зварухнулася і хітравата падмаргнула яму.

***Жнівень 2026 г.***

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (243), лістапад 2026 года

# Білет на адну паездку

Алена ВАРАНЕЦ




***

*паднялася рака і ўжо затапіла тых,*
*хто бліжэй да прорвы*
*у навінах казалі, што сёлета*
*ўсіх дагоніць*

*стамлёны, хворы год*
*валіўся у вясну*
*берагі пад вадой выглядалі злучана*
*і трывожна набрыньваў будучы ліст,*
*і птушка спявала занадта гучна*

*— цяпер кожны чацвёрты абірае*
*«ляцець да зор»*
*і я ўсё разумею*
*вы з'язджаеце, але нехта мусіць*
*трымаць дазор*
*як святло выключае апошні,*
*няхай будзе светла ў маім акне*
*будзе цёпла, і суха, і соладка,*
*а як не...*

*ён на момант заціх, і стала заўважна,*
*што свет не песціць*

*— гэта дробная лужына,*
*што не здолее мяне з'есці*
*можа, толькі крыху падрасце*
*і адрэжа яшчэ прасторы*
*але гэта дэталі*
*лічы, прыліў на пясчаны бераг*
*тут, як на моры*

*ён працягваў стаяць,*
*хоць паводка ішла ў горад*
*можа, думаў пра нешта сваё,*
*не зважаў на праклятае сонца*
*і прыкры клёкат.*
*жыхары ліхалецця слухалі*
*першага грому няпершы рокат*

*што праклёўваецца ў галаве*
*ў такі нетыповы момант?*

*штосьці пра велічэзнасць*
*і немагчымасць руху*
*штосьці пра скруху*

*прыпавесць, як вада,*
*не давала згоду*
*тое, чаго ледавік*
*не сказаў крыгаходу*

***

*пакуль я кармлю з рукі*
*ўнутраных рыб*
*і голас сыходзіць углыб*
*чуваць як у акварыум*
*штосьці ўпарта б'ецца —*
*гучыць адчайна*

*ты блытаешся ў калідорах*
*майго маўчання*
*я згортваюся як кроў*

*не лезе ў горла шурпатае слова*
*роў*
*кіта ў маім чэраве*
*лямант глухой траскі*
*кавалачкі лускі сыплюцца*
*халодная плынь*
*прадзіраецца напрасткі*

*а ўсё ж узяло за жабры*

*абрыдла ўдыхаць праз раз*

*выгараюць кадры,*
*дзе мы плылі за буйкі*
*і дзень здаваўся такім даўгім*

*антракт*
*і падводны хор*
*спявае бязмоўны гімн:*

*«нікому не выйсці*
*з салёнай вады сухім*
*ледзь-ледзь памачыўшы ногі,*
*знаходзіш сябе на дне»*

*ужо набягае хваля,*
*якая нас праглыне*

*ты выберашся на бераг*
*а я не*

***

*я гляджу на цябе*
*і расшпільваецца паліто*
*пралазіць у шчыліну радасць,*
*зрываецца з павадка*
*ёсць яшчэ шанец злавіць,*
*але хібіць, чапляецца*
*за рукаво рука*
*радасць руйнуе сцены,*
*зрывае столь*

*хваля пяшчоты не лашчыць,*
*а б'е наводмаш*
*свет правярае*
*ці мы апынемся здольнымі*
*вытрымаць радасць,*
*пакуль яна носіцца коламі*

*я хацела б казаць*
*«да мяне, радасць»*
*«радасць, побач»*

*зрэшты, досвед*
*трымаць свой ланцуг*
*я ўмею змалку*
*назіраць за вадой і не плыць*

*лёс вагаецца, разважаючы*
*што рабіць*
*ён падкідае манетку*
*і зноў выпадае*
*кідаць мне палку*

*надта свабодны ашыйнік*
*усёю вагою вісіць на карку*

***

*бачыш, у сярэдзіне*
*быццам рыса*
*так, дакраніся,*
*калі не грэблівы*
*толькі гэта не рэбры,*
*а след ад шын*
*шолах машын*
*закалыхвае ў сон аорту*

*трэск*
*— і каго тут вынесла на дарогу?*
*трасца, не могуць паставіць*
*нават самых банальных*
*знакаў*
*чарговы ўжо небарака нажыў*
*нечакана на помнік*
*з базальту*
*штодня ад асфальту цішком*
*адскрабаюць дзесьці*
*кагосьці*

*паэзія сёння ламае косці,*
*каб заўтра яны срасліся*
*па-новаму*

*калі разабрацца, што яму*
*ад па́ры дакладных слоў?*
*у пытанні асноў чалавек*
*як крупіна кашы*
*у агульнай масе*

*проста кагосьці ў мясе*
*цікавіць фарш,*
*а кагосьці прожылкі*
*цягне ў абдымкі нажа,*
*і ніколі не досыць*
*ціха душа выходзіць парам*
*у пакеціку з выразкай*
*як расказаць адбіўную*
*майго сэрца?*
*вогнішча грэецца,*
*хутка пачнецца,*
*кухар нясе патэльню*

***

*выходжу з гатэльнага нумара*
*выбіраю таблічку на дзверы*
*«калі ласка, прыбярыце пакой»*
*«тшшш, ціха, я сплю»*
*бракуе толькі*
*«разбурыце парадак рэчаў»*
*«калі ласка, разбудзіце мяне»*

***

*твой транспарт, як і каляды,*
*прыходзіць так ці іначай,*
*хоць ты ўжо даўно не верыў,*
*стаміўся лічыць гадзіны*

*кіроўца цябе ўбачыў*
*і болей ты не адзін*

*сядаеш на Маршалкоўскай,*
*і што за вакном – няясна,*
*бо снег замятае сёння так моцна,*
*што будзь здароў*
*сняжынкі віхрыць, уласна*
*як думкі ўнутры галоў*
*кісель твайго розуму боўтае*
*шторазу на паваротах*
*мяшаецца брукаванка*
*з будынкамі навырост*
*чаму ў цябе соль на ботах?*
*дзе бачыў падобны мост?*
*дарога ідзе наўпрост*
*трамвай жыхароў гайдае*
*люляе*

*і раптам дзверы*
*адчыняцца асцярожна*
*наступны прыпынак «возера»,*
*«малінаўка 3», «усход»*
*ты ведаў на памяць кожны*

*паверыць у цуд няможна,*
*хоць быў дзіўнаваты год*

*як быццам не ловіць сувязь,*
*а ты атрымаў смску:*
*— у гэтым чароўным свеце*
*знаходзься, перадавай*
*білет на адну паездку*
*аўтобус тралейбус трамвай*

# Дзедавы казкі



Міхась ЗІЗЮК

*У самым сэрцы нашай Беларусі, у сталіцы краіны Мінску, жывуць дзве мілыя дзяўчынкі — Даша і Алёнка. Вяселыя, няўрымслівыя сястрычкі, якія іншым разам сварацца з-за рознай драбязы. Алёнка і Даша вельмі любяць прыроду, жывёлу, у кватэры разам з імі жывуць сабака Цімі і кот Алекс. Любяць дзяўчынкі прыязджаць у госці да дзядулі з бабуляй. Калі яны былі маленькімі, то клаліся спаць толькі тады, калі дзед Міхась расказваў ім казку. А пачалося гэта так. Неяк Алёнка, старэйшая ўнучка, папрасіла:*

*— Дзядуля, раскажы нам казку.*

*— Якую казку? Пачытаць кнігу?*

*— Не, не з кнігі, іншую.*

*— Іншую?*

*Дзядуля падумаў крыху, а пасля сказаў:*

*— Давайце раскажу вам гісторыю пра хамяка Хаму.*

*— Хамяка Хаму? Давай, — узрадаваліся дзяўчынкі.*

*— Тады слухайце…*

## Хамяк Хама

Вялікая нашая краіна — Беларусь. Шмат у ёй лясоў, рэк, азёр, палёў. І паўсюль там сваім жыццём жывуць розныя жывыя істоты. Мы ведаем, што лес насяляюць ваўкі, лісы, зайцы, дзятлы ды шмат іншых жывёл і птушак. У рэках і азёрах плаваюць шчупакі, акуні плоткі, карасі. У палях жывуць мышы-палёўкі, краты ды казуркі розныя. Усім хапае месца. А сёння мы пазнаёмімся з яшчэ адным прыгожым і цікавым жыхаром палёў — хамяком Хамой.



Хама нарадзіўся ў норцы, якую бацькі выкапалі на пагорку бліз невялікай дубровы. Добра і ўтульна было яму з мамай і татам. Ён хутка рос, пачаў выбірацца з норкі ды гуляць каля поля. Наш Хама быў надта ж цікаўны, хацеў усё ведаць: чаму дзень змяняе ноч, як расце збожжа, куды ляцяць птушкі. І вось, аднойчы, ён адышоўся далёка ад нары: вельмі ж яму хацелася паглядзець, куды гэта хаваецца сонейка на ноч. Раптам убачыў Хама нешта страшнае, вялізнае і незразумелае. Яно моцна шумела ды ішло на хамяка. Спалохаўся Хама — ён не ведаў, што гэта быў трактар — і кінуўся наўцёкі. Так ён і згубіўся.

Што ж рабіць? Пахадзіў Хама туды-сюды, а ўсё незнаёмае, не ведае, дзе яго дом. Вырашыў Хама, што будзе жыць адзін. Знайшоў утульнае месца пад разлапістым кустом: поле побач, рэчка блізка. Выкапаў сабе глыбокую норку, услаў норку сухою травою. Агледзеў і застаўся задаволены вынікамі сваёй працы. Прысеў Хама каля сваёй норкі. Ззаду шумелі лісцем дрэвы, перад ім ляжала зялёнае поле. Якое ж яно вялізнае. Цяпер гэта будзе яго поле. Хома вырашыў, што трэба штосьці адшукаць сабе на абед, бо каласкі не хутка яшчэ вырастуць, няма на збожжы зярнятак.

У полі трапіўся яму тлусты вусень, некалькі чарвякоў — вось і смачная ежа. А калі вяртаўся назад, то яшчэ злавіў вялікага коніка. Добра, можна ісці адпачыць крыху, бо і сонейка спачываць на ноч збіраецца. Калі ж выбраўся Хама з норкі, то на небе ўжо свяціліся зоркі. Ціха, цёпла, спакойна — добра. Але ж стала Хаме сумна — адзін ён, няма з кім нават словам перакінуцца, паразмаўляць. Ва ўсіх свае справы. Удзень сарока сядзела на сасне, але ёй нецікавы быў Хама. Мыш-палёўка (гэтая мышка, што жыве ў полі) праскочыла, але і яна чмыхнула носам ды пабегла далей. Дрэнна аднаму, падумаў Хама, дрэнна, калі няма мамы і таты. Уздыхнуў хамяк і палез у норку класціся спаць.

## Хама і Красавічок

Раніцай Хама выправіўся на рэчку памыцца ды вадзічкі папіць. Калі ж ішоў назад, то сутыкнуўся на сцежцы з невядомым даўгавухім зверам. Хама кінуўся хавацца ў адзін бок, а звер у другі. Пабачыў хамяк, што звер баіцца яго, асмялеў, вылез кустоў:



— Ты хто?

— Я зайчык Красавічок. А ты хто?

— А я Хама, я жыву тут. Бачыш поле — яно маё.

Заяц таксама вылез з куста.

— Тваё поле? Чаму гэта яно тваё? — здзівіўся ён.

— Бо я першы яго знайшоў, значыць, яно належыць мне.

— Вось яшчэ, — не пагадзіўся Красавічок, — поле ўсіхняе, яно вялікае — усім хопіць збожжа, калі яно вырасце. Ты ж не зможаш вартаваць усё поле.

Хама задумаўся, пачухаў галаву і адказаў:

— Мабыць, так, я пра гэта не падумаў. А ты што тут робіш?

— Прыйшоў з лесу вады папіць ды паесці смачнай зялёнай кукурузы — яна расце за тваім полем.

— Ой, і я хачу кукурузы, — узрадаваўся Хама. — Пакажаш мне, дзе яна?

— Пайшлі.

Красавічок з Хамой паласавaліся сакавітай кукурузай ды вярнуліся назад.

— Ты жывеш у лесе. А там добра? — пацікавіўся хамяк.

— Так, я жыву з мамай, татам, а яшчэ ў мяне тры браты і сястрычка. У нас маленькі домік. Красавічком мяне назвалі таму, што я нарадзіўся ў красавіку. У лесе нам добра, але ж там патрэбна быць асцярожным — ваўкі, лісы, рысі таксама там жывуць.

— Дык сюды прыходзьце — тут нікога няма, будзем жыць разам, — прапанаваў Хама.

— Не, — адказаў Красавічок, — тут няма, дзе схавацца. Да таго ж тут лётаюць ястрабы ды арлы, у полі таксама трэба быць пільным.

— Тады прыходзь да мяне ў госці, мне аднаму сумна.

— Добра, прыйду, — паабяцаў Красавічок.

Хама клаўся спаць і ўзгадаў Красавічка. Добра, калі ў цябе ёсць сябар, добра, калі ты не адзін у гэтым свеце…

А цяпер будзем спаць, — сказаў дзядуля.

— Не, не, — у адзін голас запярэчылі дзяўчынкі, — мы хочам ведаць, што было з Хамою далей.

Далей будзе заўтра, дзеткам час засынаць.

Давялося Алене і Дашы паслухацца дзеда. Назаўтра яны не маглі дачакацца таго часу, калі трэба будзе класціся спаць.

— Ну, гатовыя слухаць? — спытаў дзялуля.

— Так, так, давай хутчэй, — дзеці ўдадкаваліся з любімымі цацкамі і нецярпліва паглядалі на дзеда.

То, слухайце.

## Хама і дождж

Хама шукаў сабе ў полі ежу на абед. Ён заўважыў, што неба пацямнела, сонейка схавалася за вялікаю чорнаю хмараю. Але хамяк нават і не падумаў, што будзе дождж. Дожджык пачынаўся паступова. Спачатку кап, кап, пасля кап-кап-кап-кап, потым ён паліўся буйнымі кроплямі. Да норкі бегчы было няблізка, Хама стаяў і не ведаў, дзе яму схавацца.

— Вой-вой, я ж увесь змокну, — забедаваў Хама, — што ж мне рабіць?

Зялёнае збожжа не хавала яго ад дажджу, а ўкрыцца не было чым. Хама пабег назад да сваёй норкі. У нейкі момант Хама трапіў у невялічкую лужыну, запэцкаўся ў гліне і павярнуў назад. І тут ён зразумеў, што не ведае, куды яму бегчы, у які бок. Дзе яго норка? А што, калі папрасіць дождж, каб ён спыніўся і пашкадаваў хамяка.



— Дожджык-дожджык, калі ласка, спыніся, я і так ужо змок. Калі ласка, я прашу цябе, дапамажы мне. Дожджык, ты вельмі харошы, вельмі-вельмі прашу цябе, дапамажы!

Мабыць, Хама так хораша прасіў, што дожджык стаў сціхаць, хмара папаўзла ўбок, неба пасвятлела. І хутка выглянула сонейка.

— Ура, ура! — закрычаў Хама. — Дзякуй табе, дожджык!

Ён заскакаў ад радасці. Але ж у якім баку яго дом? Можа, сонейка дапаможа яму?

— Сонейка, сонейка, дапамажы мне знайсці мой домік, калі ласка.

І сонейка рассыпала свае промні ў адзін бок. Хама хуценька пабег туды. Яшчэ трошкі — і ён каля сваёй норкі. Узрадаваны, Хама падзякаваў сонцу за яго дабрыню ды ўзяўся сушыць сваё футра. Калі ён ляжаў і грэўся пад сонцам, то падумаў: калі нечага хочаш, то трэба вельмі старанна і ветліва прасіць. Тады табе абавязкова хтосьці прыйдзе на дапамогу. І, канешне ж, не забываць шчыра дзякаваць за гэта.

## Хама і арэшак

Выбраўся хамяк з нары, агледзеўся: ці не пільнуе яго ястраб або арол. Здаецца, ціха. Ледзь ступіў адзін крок, як раптам нешта ўпала яму на галаву. Спалохаўся Хама, кінуўся назад у норку. Пасля асцярожна выглянуў, але нікога не заўважыў, толькі на зямлі ляжаў арэх, што зваліўся з куста. Вось хто яго спалохаў. Падняў Хама арэшак, пакруціў і падумаў: а што, калі яго пасадзіць? Вырасце новы куст, там будзе многа смачных арэшкаў — добры запас яму на зіму. Адышоў хамяк убок, выкапаў неглыбокую ямку, паклаў арэшак ды засыпаў зямлёю.



Наступнай раніцай Хама першым чынам пайшоў праверыць: ці падрос арэшак. Але той ляжаў сабе, ані не павялічыўся ў памерах, не пусціў карэньчыкаў. Можа, яго паліць трэба? Пабег Хама на рэчку, набраў вады і паліў арэшак. Заўтра дакладна павінен пачаць расці.

Але і назаўтра арэшак ніяк не змяніўся. Можа, яму цяпла не хапае? Пагрэў Хама арэшак у сваіх лапках, паклаў у ямку, укрыў сухімі лісточкамі ды травою. Цяпер дык павінен ужо расці.

Раскапаў раніцай Хама арэшак і засмуціўся. Нічога не змянілася. Што ж яму рабіць? У гэты момант ён пачуў, як хтосьці ціха смяецца. Зірнуў хамяк, а там, на кусце, верабейка.

— Ты чаго смяешся? — спытаў Хама.

— Чырык, — адказаў верабей, — я бачу, як ты кожную раніцу выкопваеш арэх, і мне смешна ад гэтага.

— Нічога смешнага. Я хачу, каб арэх вырас, тады ў мяне будзе шмат смачных арэшкаў.

— Ха-ха, — засмяяўся верабей. — Нічога ў цябе не атрымаецца.

— Чаму?

— Таму. Каб арэх пусціў карэньчыкі, патрэбна нямала часу. Спачатку ён перазімуе, набярэцца сіл, пасля, вясною, ён прыгрэецца пад сонцам і пусціць карэньчыкі. Вырасце маленечкі кусцік, з кожным годам ён будзе павялічвацца, аж пакуль не стане такім вялікім, як гэты куст. І толькі тады на ім будуць расці арэхі.

— Як жа доўга чакаць трэба… А я думаў, што не. Эх.

Пайшоў хамяк шукаць сабе сняданак. Ён зразумеў: каб атрымаць плады з дрэва ці куста, патрэбен час. Не заўсёды ўсё адбываецца так хутка, як мы таго хочам. Трэба быць цярплівым і ўмець чакаць.

## Хама і парады Красавічка

Хама чакаў калі яго наведае Красавічок. Ён болей бачыў, пабываў у розных месцах, таму зайчык больш ведае. Тым часам каласкі ў полі пажаўцелі, пацяжэлі і сталі хіліцца ўніз. Хама ведаў, што цяпер іх можна збіраць і рабіць сабе прыпасы на зіму. Ён цягаў каласкі праз дарогу, выбіраў зярняткі і насіў збожжа ў сваю норку. За некалькі дзён сабраў цэлых тры мяшочкі. Хама радаваўся: цяпер у яго ёсць запас.



У адзін сонечны дзень на поле прыехалі вялікія і шумныя машыны. Хама ўжо ведаў, што гэта камбайны. Камбайны сажнуць збожжа, змалоцяць каласкі — і поле апусцее. Застанецца толькі салома, якую пасля тасама прыбяруць. Будзе тут пуста і няўтульна. А Красавічок усё не прыходзіў.

Хама пачаў думаць, што зайчык забыўся пра яго. Але аднойчы раніцай хтосьці гучна павітаўся з ім яшчэ здалёк:

— Прывітанне, Хама!

— Прывітанне, Красавічок, прывітанне! — узрадаваўся Хама. — Чаму цябе так доўга не было? Я чакаў цябе.

— Ведаеш, каля нашага доміка быў моцны пажар. Таму мы перабіраліся на новае месца. Пакуль зрабілі новую хатку — вунь колькі часу пайшло. А чаму ты пытаешся?

— Мне аднаму тут цяжка, — паскардзіўся Хама. — Аднойчы да мяне сабака хацеў дабрацца, ледзь ад яго выратаваўся. А цяпер тут, каля дарогі, шумна. Поле апусцела, мяне здалёк могуць убачыць ці ястраб, ці сава. Яшчэ і сумна мне.

— А хочаш быць нашым суседам?

— Як гэта?

— Ты забярэш свае рэчы і будзеш жыць у лесе. Каля нашай хаткі мы дапаможам пабудаваць табе сваю. У нас побач жывуць вожыкі, вавёркі, сарокі, сінічкі. Уяўляеш, як там весела і цікава.

— Мне сапраўды можна да вас? — узрадаваўся хамяк.

— Канешне.

— А ты дапаможаш мне перанесці мае рэчы і запасы?

— Так.

— Добра. Тады я хуценька развітаюся з мышкаю Адэлькаю, і мы будзем збірацца.

Хама пабег да мышынай норкі, паклікаў добрую і спагадлівую мышку:

— Адэлька! Адэлька!

— Што здарылася? — высунулася мышка.

— Хачу развітацца з табою і тваім сямействам. Я буду перабірацца на новае месца — у лес. Там мне будзе лепш.

— Шкада, — зазначыла Адэлька. — Ты добры, харошы сусед. Пачакай, я зараз прынясу табе падарунак.

Яна знікла ў норцы, пасля зноў выскачыла.

— Вось табе яшчэ пакуначак з чорным перцам. Будзеш у суп падсыпаць і мяне ўзгадваць.

— Дзякуй, Адэлька, — Хама паклаў пакуначак у кішэню. — А мне твой перац яшчэ дапамог ад сабакі абараніцца. Калі ў мяне будзе час, я абавязкова наведаюся да вас і прынясу з лесу свой падарунак. Бавайце.

— Бывай, Хама.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 11 (243), лістапад 2026 года

# Лапікавая коўдра

## Ліст да Яна СКРЫГАНА

Алесь ПАШКЕВІЧ



Ян СКРЫГАН

*

Дзядзька Ян, паважаны Ян Аляксеевіч, я перад Вамі вінаваты…

Упэўнены, разумееце, што называю Вас так — дзядзька — умоўна, па нашай даўняй традыцыі, бо ўзростам сваім блізіцеся хутчэй да малодшага сына майго прадзеда Мітрафана Пашкевіча, а да майго дзеда па той жа лініі — Вашага цёзкі Івана — як брат. Таму собіць зваць мне Вас няйнакш як «дзед Ян», — аднак дазвольце мне трымацца нашай даўняй беларускай традыцыі, якую, зрэшты, прапісвалі і Вы.

Дык вось, вінаваты я перад Вамі, дзядзька Ян, найперш у тым, што ў Вашыя апошнія гады — 1991-шы і 1992-гі — не напрасіўся і не сустрэўся з Вамі. А Вы ж — найблізкі мне пісьменнік: і па духу, і геаграфічна.

Патлумачу. Па духу — гэта найперш па мове, мове нашай агульнароднай Случчыны, а дакладней — маёй вёскі Набушава (у Вашую маладосць — засценка, які называлі і Забушоўе).

Дазвольце напачатаку спехам раскрыць два памянёныя пункціры — духоўны (небны) і геаграфічны (зямны).

Першы — моўны. Якая ў Вас мова! Разумею цяпер, што якраз так некалі гаварыў і мой набушаўскі прадзед з прабабуляй, і іх дзеці, і ўсе вяскоўцы. Ну, прынамсі, амаль так. *Лядáйкі* [«добрае і лядайкае»], чытаць *учуткі, куткавы* пакой, *кожын* дзень, *старызнік, пахошчы, папрастарэкаваць, напярэхваткі, напярэсцігі, засерадкавацца, надармяк, жарства, дзындра* (шлак)… А вось упісанае Вамі «адлюстровак» — ці зусім «нашае» яно? Сцвярджаюць, што першым гэтае слова — адлюстраванне — прыдумаў-ужыў Уладзімер Дубоўка ў Вашыя бурапенныя часы. Адлюстровак Ваш — як адзінкавы адбітак; адлюстраванне ж, думаецца, шырэйшае — як выявы аблокаў на хвалістай вадзе. Ці не так?

Аднак мову вызначае не адна лексіка. А і Ваш сінтаксіс: «*аб адным дні* загарацца жоўтым лістом бярозкі; *па нейкім часе; у вінах я не знаюся…*»

А Ваш — наогул — стыль! «*Насустрач мне нёсся лес, б'ючы па твары, абдзіраючы рукі, ірвучы сарочку, колючы ў ногі сваім няроўным, усыпаным ігліцаю і сухім ламаччам долам»; «Нядаўна я зноў хадзіў у сваім дзяцінстве. Быў сцюдзёны вечар зімы… Дрэвы ў парках стылі ў сваіх снах, сплеценых у іскрыстыя карункі з абледзянелай імжы…*»

Нямала ўсё ж такі, трэба прызнацца, многа ў Вас у прозе найперш ад любімага Вамі Буніна. У яго Вы, дарэчы, адшуквалі… беларускамоўны след. Працытую: «У Буніна ў "Истории с чемоданом" напісана: "Что до чемодана, о котором идёт эта повесть". Чыста беларуская будова фразы».

У мове, як і ў будове, Вам не было роўных.

І яшчэ — наўздагон. Ледзь не забыў адзначыць, як Вы шчыра любіце пунктуацыйныя знакі: двукроп'е і працяжнікі, і як не паважаеце апострафы, прапаноўваючы замяніць іх ці на цвёрдыя (ъ), ці на мяккія знакі (з'еў — зьеў).

Наогул, Вы б мусілі сядзець у акадэмічным крэсле кіраўніка Інстытута мовазнаўства, а не Кандрат Крапіва, слоўнікі пад рэдактарствам якога Вы неаднакроць слушна крытыкавалі.

Зрэшты, слоўнікі можна і перапісаць, а вось гісторыю, жыццё — не…

Аднак загаварыўся я, прабачце. Цяпер — пра другі пункцір нашай блізкасці і «крэўнасці»: геаграфічна-зямны. Случчына нашая ўсё ж, прызна́емся, не такая і малая, калі разумець у ёй і клецкія, і капыльскія абшары. А вось мая радзінная вёска Набушава была і застаецца зусім невялічкай, больш за сорак хат у ёй аніколі не было. Адна вулка ды другая, меншая, — «хутар», як і пры мне яе звалі… Ну і яшчэ легенды заставаліся пра Набушава-Забушоўе — як пра колішні багаты засценак, дзе жыла «шляхта нездыхалая». Паводле іх і прадзед мой Мітрафан успрымаўся «шляхцічам» — хоць працаваць мусіў за некалькіх мужыкоў, а на малітву меў час, калі ішоў з працы ды сушыў на галаве, перавярнуўшы спадыспаду, мокрую ад пота шапку.

Дык вось — пра маё Набушава Вы згадвалі і пісалі часцей, чым нават я, грэшны. Тлумачылася гэта проста: за набушаўскага хлопца — Вашага цёзку Яна-Івана — выйшла замуж Вашая родная сястра Аксеня. «Замужоўства Аксеніна праходзіла лёгка, як бы яна пра гэта ніколі не думала, — згадалі Вы ў "Кругах". — Усім сваім залётнікам яна адмаўляла з самай мілай прастатою, — што ёй яшчэ не пара́ выходзіць замуж, — і не мала здзівіла ўсіх, калі выбрала Івана Сасноўскага з Набушава, чалавека не так ужо і паказнога, сухатварага, страгавокага, з чорна-паджарымі вусамі, якія рабілі яго намнога старэйшым».

Больш за тое: да набушаўскай «шляхцянкі» ледзь не сасватаў быў Вас Ваш бацька! Зноў працытую «Кругі»: «Бацька бачыў маю нуду, разумеў па-свойму: ці не пара ажаніць хлопца? Ужо нават нагледзеў і маладую — шляхцянку з-пад Забушоўя: вельмі ж хацелася яму парадніцца з шляхтаю. Аднаго разу я нават убачыў яе: ну што ж, дзяўчына як дзяўчына, няхай гадуецца».

Так, бывалі Вы ў Набушаве — не раз. Гасцявалі ж, пэўна, у сястры, а перад тым — і на яе вяселлі гулялі… А пазней — пасля «сібіраў» — адведвалі — у 1960 і 1970-х. Пры мне малодшыя Сасноўскія з'ехалі з вёскі, Вашую сястру мне не давялося заспець. А мая мама згадала яе — жыла ж (!) побач з маёй хатай, на адным баку вуліцы, праз *магáзін* (прасценькі драўляны дамок). Згадала мама і Ваш прыезд да сястры — жанкі сама збіраліся ісці даіць на поле каровы…

Не цураўся Вас і пляменнік — Іван Сасноўскі-малодшы. «У нас начуе Ваня Сасноўскі, — занатавалі вы ў дзённіку 16 кастрычніка 1977 года. — Ён тут на курсах як старшыня сельсавета Амгавіцкага [Вы ж не забылі: Амгавічы, цяперака Амговічы — старадаўняя вялікаватая вёска-мястэчка кіламетраў за дзесяць ад Набушава]. Заўтра з Аняй [г. зн. Вашай жонкай і цёткай пляменніка] яны паедуць у Забушоўе».

Вось гэтае маё «Забушоўе» сталася блізкім-родным і Вам — настолькі, што і ў нямогла-хваробныя свае гады не пакідалі Вы спадзевак-мар наведацца туды. «Калі дасць бог мецьмем сваю машыну (вельмі ж чакаю тую "Таўрыю"), — прызнаваліся-планавалі Вы ў траўні 1988 года ў сваім дзённіку, — найперш неўзаметку аб'езджу мясціны свайго маленства. Труханавічы, Хваевічы. І суседства: Гарахоўку, Гольчыцы, Боркі, Ніву; Грэзак, Падлужжа, Прошчыцы, Набушава, Амгавічы. Адтуль жа я вырас, стаў чалавекам».

Вырастаў адтуль жа і я!..

У Вас нават і прымаўкі былі набушаўскія. Адну з іх Вы запісалі: «Ні ў тым сіла, што кабыла сіва, а што воза не вязе». Адно хіба што крыху «памыліліся». Ад свайго суседа дзядзькі Цімы я чуў такое: «Ні ў тым дзела, што кабыла бела, — а што воза не вязе». Так, пэўна ж, пагадзіцеся, больш сэнсоўна. Якая ж сіла, калі кабыла воза не цягне? Ды і гэтае наставуранае як на сёння слова «дзела» Вы шматкроць баранілі ды ўжывалі…

*

Вы былі надзвычай чулым на любыя праявы дабрыні, чалавечнасці, беларускасці. Пасля доўгай вымушанай разлукі з Радзімай у цягніку, які вёз у Мінск, уважліва і замілавана прыслухоўваліся да роднага вымаўлення суседскіх пасажыраў — пабойваючыся, ці не развучыліся самі гаварыць па-свойму. А неяк вычытаўшы ў часопісе ліст жанчыны, якая — як прызнавалася — зсумавалася ў далёкім расійскім горадзе па беларускай мове, не ленаваліся пазваніць у рэдакцыю і папрасіць адрас — ды ішлі на пошту, каб выслаць незнаёмцы сваю кнігу з душэўным надпісам…

Вы былі надзвычай чулым, хоць у сваім гаротным жыцці той чуласці, спагадлівасці да сябе мелі вобмаль, рэдкія — як напісалі б Вы — калівы. Вось жа і я, толькі-толькі прыжываючыся ў сталіцы, не паспеў яшчэ ўчытацца ў Вашыя «Кругі» ды не наважыўся патрывожыць Вас сваім сціплым тэлефанаваннем, а то і — сустрэчай. А калі толькі паспеў увабрацца ў студэнцка-філалагічную (ды і калялітаратурную) сілу — Вас не стала.

«Усё жыццё маё — як казка, толькі нядобрая, суровая. Як чужая», — гэта з Вашага апошняга дзённікавага запісу 20 ліпеня 1992 года. А смерць не дазволіла Вам даказаць-даслухаць тую казку 18 верасня.

Вось і складаю гэтыя радкі, запознена ўсведамляючы, што не паспеў напрасіцца на другую сустрэчу…

Першая ж была ў 1985 годзе, калі пабачыў Вас у сваёй Вясейскай школе. Вы прыехалі на выступленне разам з земляком Васілём Віткам. Памятаю абодвух: былі як браты, штось блізкае-падобнае і ў паставах, здаецца, і ростам сходныя, у акуратных цёмных касцюмах, белых кашулях з нешырокімі гальштукамі. Адно гальштукі розныя: Ваш — у чорна-белыя гарызантальныя палосы. Абодва ў акулярах, што на той мой вясковы час сустракалася нячаста. Вашыя акуляры былі адметнымі, з нейкімі падвойнымі лінзамі, паката прымастачанымі з двух паўкругаў-авалаў, з таўставатай чорнай пластыкавай дужкай-аправай зверху, па ёй разыходзіліся густыя цёмныя бровы — і твар Ваш праз тое меў штось мудра-савінае. І рухі — няспешныя, прыцішаныя, асцярожныя. І ўсмешка — лёгкая, скрытная, далікатная…

У школе быў музей Вялікай Айчыннай вайны, палова яго займалі «інтэрнацыянальныя» экспанаты, — дзейнічаў вучнёўскі Клуб інтэрнацыянальнай дружбы: піянеры перапісваліся з аднагодкамі-тэльманаўцамі з Нямецкай Дэмакратычнай Рэспублікі. І вось я як старшыня тога «клуба» праводзіў вам дваім экскурсію — худаваты падлетак з чырвоным гальштукам ды настаўнікавай указкай… Распавядаў — на жаль, па-руску. Што ж паробіш: і тэма была «інтэрнацыянальная», і ўся наша Случчына зрабілася такой. Ведаю цяпер, як Вы абуджаліся надзеяй і радасцю, калі чулі ад маладых беларускае слова, і як не ўспрымалі, калі не сказаць недалюблівалі, «новы» Слуцак, ушчэнт зрусіфікаваны ды перайначаны — разам з прылеглымі паселішчамі. Згадайце хоць бы колішняе мястэчка Раманава, у якім нарадзіўся кампазітар, аўтар музыкі гімна БНР «Мы выйдзем шчыльнымі радáмі…» Уладзімер Тэраўскі, — яго, мястэчка, назвалі… Леніна (каб не мела асацыяцый пра цароў Раманавых). Вы памяталі той Слуцак — 1920—1930-х гадоў, свой, непераробленый. Ды што ж зробіш: да 1939-га горад быў памежным, за ім — паўтаруся, «Польшча», аддадзеныя бальшавікамі нашыя землі (якімі, разам з іх насельнікамі, «вызваліцелі» адкупіліся ад немінучай ваеннай паразы), а ў невялікім Слуцку — ажно дванаццаць вайсковых частак з афіцэрамі ды салдатамі з усяго неабдымнага Саюза ССР. Ды і не яны адны спрычыніліся да адбеларушвання…

Калі я — ці не напрыканцы «экскурсіі»? — прачытаў, стараючыся, Гамзатаўскі ўрывак пра белых журавоў, у якіх ператварыліся загінулыя салдаты, «с кровавых не пришедшие полей», — толькі тады, здалося, Вы ажывіліся, абудзіліся: спешка падышлі і далікатна абнялі мяне (дакрануліся амаль нячутна, бераўліва, мякка)…

Пасля той сустрэчы ў мяне засталася надпісаная Вашая кніга «Руки на кленовом листе» (не адразу зразумеў, што перакладзеная з беларускай мовы Валянцінай Шчадрыной, а напачатку ж быў спанталычаны: як так — пісьменнік беларускі, а кніга — па-руску?), кніга ў цёмна-зялёнай пахкай каленкоравай вокладцы — і з размашыста-настраёвым аўтографам: «Дарагому Сашу Пашкевічу…»

Калі вярнуўся дадому, насупраць маёй набушаўскай хаты густа асыпаліся з суседскага клёна дзеда Корзуна лапавухія лісты — і пад дрэвам ляжала пухнатая, стракатая, жоўта-руда-чырвона-карычневая коўдра — рыхтык як лапікавая. І так дбайна склалася-сшылася яна: лісцік да лісціка, як старонка да абачынкі, як дзень да ночы…

Гэта быў адзіны на ўсю вёску клён. Уздоўж вуліцы амаль спрэс раслі вязы.

…Ваш лёс, як і творчасць, — своеасаблівая лапікавая коўдра. Рвалі-кроілі яе неўгамонна, а Вы нястомна сшывалі-складвалі: і ўспаміны, і гады, і пачуцці. Як тыя свае «Кругі» — з прачулых згадак, пранікнёных споведзяў ды колішніх не забытых апавяданняў.

Лёгкая, мяккая і цёплая тая Вашая коўдра…

*

А лёс Ваш — і быццёвы, і творчы, — як копія-матрыца лёсу ўсяго літпакалення 1920-х: дэбютны маладнякоўскі ўзлёт, апантаны рамантызм, непараўнальныя-непераўзыдзеныя і да сёння (магчыма ўжо — і ніколі) моўнае багацце, чысціня, самабытнасць, самавітасць. І — збіццё на ўзлёце: арышт, надуманае следства, лагер-высылка; цяжкае вяртанне, комплекс «інакшасці» ды немарасцевыя сны-мроівы аж да смерці (лагер, шконка, вошы, здзекі, чаканне…).

І, па вялікім рахунку, галоўным Вашым тэкстам стала згаданая ўжо не раз мастацка-аўтабіяграфічная аповесць «Кругі», якую Вы хацелі напачатку назваць «Свая аповесць» — амаль як назваў падобную спавядальную «Аповесць для сябе» Ваш сябар Барыс Мікуліч.

А пачыналі ж — прызнаемся тут, як і Вы самі канстатавалі — з шаблоннага і ненатуральнага для свайго светаадчування пераймання, капіравання, імітацыі чужых вершаваных форм расійскага футурызму (у ядоўгавечнай «рэвалюцыйнай» Літаратурна-мастацкай камуне). Але чужасць тую ўсвядомілі своечасова — і загаварылі натуральна сваёй прозай, да якой Вас пераканаўча «прыгаварыў» пры сустрэчы Максім Гарэцкі. «Вам трэба перастаць пісаць вершы. Яны ў вас надуманыя, нежывыя. Як толькі вы берацеся за верш, вы стараецеся рабіць яго модна, шукаеце чужых, ненатуральных слоў, — прыгадвалі Вы парады жывога класіка. — Навошта вам "перлы дум", калі вы самі не ўяўляеце, што гэта такое? Ад усяе душы я настаўляю вас на прозу. Толькі яна паможа вам. Пішыце прозу».

Вы былі старанным і разумным вучнем…

З чужога ж насення не атрымалі натхнення. Пачалі з вершаў пад псеўданімам Пірат, затым сталі Відуком (так зваўся і дзікі мак), і здолелі ўсё ж пераадолець у сабе схільнасць да крыклівай моднасці, што ішла з чырвонай Масквы — ад Маякоўскага з яго футурыстычнай камандай.

Куміры з'яўляліся і знікалі, а настаўнікі (Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі) засталіся назаўсёды.

**Заканчэнне на стар. 11 »**

# Лапікавая коўдра

## Ліст да Яна СКРЫГАНА

**« Заканчэнне. Пачатак на стар. 10**

*

Забралі вас з Дома творчасці пад Пухавічамі — былога панскага мураванага маёнтка. Пабач — састарэлы восеньскі сад… Рэчачка неўздалёк… 1936 год, 13 лістапада…

З першай жонкай Галінай не паспелі пражыць і паўтара года. А сына ад яе так ніколі і не пабачылі, адно, запознена адшукаўшы яго ў Нямеччыне, зрэдчас ліставаліся…

Судзілі Вас амаль пра год — 4—5 кастрычніка 1937-га. Па «тыповым» 58-ы артыкуле — як палітычнага. Па пунктах 10 (контррэвалюцыйныя размовы) і 11 («групаўшчына» — «калі ты гаворыш якія контррэвалюцыйныя размовы, — Вы самі пазней тое тлумачылі ў дзённіку, — то ты ж гаворыш іх некаму. Вось гэтыя два пункты, 10 і 11 — і былі маім злачынствам. Паколькі гэта самыя "бяскрыўдныя" пункты, то такім злачынцам, як я, часамі дазвалялі хадзіць па лагеры без канвою».

Але тое было ўжо ў лагеры. А тут пакуль — менская турма-Амерыканка. У кастрычніку 1937-га — масавыя расстрэлы. «Многіх нашых пісьменнікаў пастралялі. І Зарэцкага, і Галавача, і Каваля — недзе пад сотню чалавек, — згадвалі Вы ўжо ў прадапошнім сваім 1991 годзе. — Няважна: "прызнаўся" ты ў якіх "злачынствах" ці не, прысуд ішоў цераз тройкі і асобныя нарады — расстрэл. І собіла ж мне астацца ў жывых толькі таму, што ўзяты я быў, мабыць, недзе не ў першай чарзе і "следства", вядома, таксама ішло не сярод першых, і раптам недзе выявілася, што ў расстрэлах як бы выйшаў перабор. І зусім неспадзявана следства маё затармазілася, і пасля нейкага перапынку вы́клікалі, каб сказаць, што следства "будзем канчаць", і аформілі тут жа групу з 12 чалавек не на "особое совещание", а на "Вярхоўны Суд". А суд даў ужо не вышку, а па 10 гадоў лагераў і па гэтулькі ж ссылкі. Вось такім чынам я і астаўся жывы».

Тая творчая група-«дванаццатка» складалася з пісьменнікаў Астапенкі, Багуна, Баранавых, Залуцкага, Звонака, Клопава, Ракіты, Мікуліча, Хадыкі, Шушкевіча, Якшэвіча і — Вас. З усіх вярнуліся-выжылі толькі чацвёра: Звонак, Скрыган, Шушкевіч і Якшэвіч.

Змітрок Астапенка на Вашым апошнім допыце быў сведкам — і ўзяў на сябе ролю арганізатара і вярбоўшчыка ў контррэвалюцыйную арганізацыю. Сведкамі на судзе былі Міхась Зарэцкі, Платон Галавач і Васіль Каваль — і ўсе трое сцвярджалі, што вы — усе дванаццаць чалавек — з'яўляліся членамі контррэвалюцыйнай групы і што менавіта яны і завербавалі вас усіх у тую — выдуманую — «варожую» групу. Хоць падсудныя адмаўлялі тое, іх асудзілі на 20 гадоў (10 — лагера і 10 — высылкі-пазбаўлення ў правах). А Зарэцкага, Галавача і Каваля — расстралялі. Як, дарэчы, — толькі крыху пазней, — і Вашага злога следчага, прозвішча якога Вы памяталі да смерці.

Памяталі Вы — але ўжо іншай, светлай і ўдзячнай памяццю — свайго лагернага дабрадзея намесніка галоўнага бухгалтара, дзякуючы якому, магчыма, і здолелі ацалець. «Часта мне ўспамінаецца маё 19-гадовае жыццё [зняволенага бяспраўнага выгнанца, — гэта я дадаю ад сябе]. І кожны раз прыходжу да аднаго: выпадак, — прызналіся Вы, — іменна ён лёг у аснову ўсяго майго далейшага жыцця. Лепш кажучы, таго, што я выжыў і лічу сябе нармальным ва ўсіх сферах жыцця. Гэта выпадак, калі аднаго вечара, пасля таго, як усе брыгады — і рабочыя, і "інтэлігенцыя" — ужо павячэралі і пачалі ладкавацца ў пасцелях на сваіх нарах, з таго кутка, дзе звычайна спалі ўсе работнікі канторы: бухгалтары, АПЧ [агра-прамысловая частка], нарміроўшчыкі, на сваіх нарах намеснік галоўнага бухгалтара лагера Васіль Аркадацкі нямоцным голасам папрасіў увагі. Ён сказаў, што ў іх у канторы цяпер робіцца гадавая справаздача лагера і ім трэба часова памочнікі. Ці ёсць сярод нас, хто ўмеў бы чарціць бланкі розных гадавых справаздач? Вядомая рэч, што гэтакая работа мне была вядома. І я тут жа падняў руку. <…> З гэтага часу я лічу, што пайшоў мой новы лёс, які выратаваў мне і жыццё, і ўсё чалавечае існаванне. Жарты сказаць: на неймаверна цяжкія работы я больш не вярнуўся, ад чарчэння тых справаздачных бланкаў неяк адразу, без ніякіх пераходных этапаў, я перайшоў на бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць».

А лагернае беспрасвецце, халодныя брудныя нары і чорную немарасцевую трывогу Вы таксама не змаглі забыць: тыя жахі стакроць прыходзілі ў сны — ужо ў вольным часе…

*

Усе свае дзесяць лагерных і астатнія ссыльныя бяспраўныя гады Вы пісалі лісты-прашэнні ў Вярхоўныя суды БССР і СССР, пракуратуру — аб пераглядзе справы, бо не растрацілі перакананне ў невіноўнасці. І толькі на пачатку 1955 года ў аддзеле МДБ у сібірскім сяле Сухабудзім Краснаярскага краю Вам паказалі «дэпешу» з Радзімы, падпісаную намеснікам пракурора БССР, дзяржадарадцам юстыцыі 3-га класа А. Вярбіцкім. «Сообщаем, — значылася ў ёй, — что Верховным судом БССР от 29 октября 1954 г. приговор Верховного суда БССР от 4—5 октября 1937 г. по Вашему делу отменён и дело производством прекращено за недоказанностью состава преступления».

Прайшло 19 гадоў… І настала вяртанне. Але да гадоў апошніх засталіся асцярога, адчуванне непаўнацэннасці, «другасортнасці». Калегі (Броўка, Шамякін, іншыя) сустрэлі сардэчна, падтрымалі — і з працай, і — пазней — жытлом. Аднак жа ці не ў той першы пасля высылкі візіт у Мінск у 1955 годзе Вас не прамінуў выклікаць у міністэрства культуры нехта Красоўскі (ці не спецслужбоўскі псеўданім?) — і запытаўся: «А ці не будзе ў вас *помслівасці*?» «На ўсё далейшае жыццё асталося ў мяне, — прызна́ецеся Вы, — гэтае пытанне. Далікатны намёк: што няцяжка зноў *там* апынуцца».

Вось ці не праз тое — і зразумелая Вашая *асцярога* пасля вяртання, — ледзь не «на ўсё далейшае жыццё»?

Ці не таму і ў размовах — асабліва з недастаткова знаёмымі людзьмі — былі замкнёнымі, асцярожнымі, нават скрытнымі? Як, дарэчы, і ў пісьменстве. Толькі аднойчы прарвалася ў вас — наросхрыст, непрытарможана — згадка пра Курапаты ды садысцкі канвеерны допыт: «Гэта калі следчыя, пасадзіўшы цябе на край табурэта або яшчэ страшней — на ножку перакуленага табурэта, мяняючыся па чарзе або гуртам, будуць біць, з усіх бакоў крычаць у вушы, каб ты падпісаў тое, чаго яны хочуць. Допыты будуць цягнуцца запар некалькі дзён. І ты, зняможаны, без сну, без адпачынку, страціўшы адчуванне навакольнасці, часу, сэнсу падзей, аглушаны неверагоднасцю, што табе трэба стаць злачынцам, — звалішся непрытомны на падлогу. Цябе абліюць халоднаю вадою, зноў пасадзяць на табурэт (або на яго ножку) і пакажуць сілу, каб ты нарэшце зразумеў, што ратунку няма…»

Прызна́емся: той вірус недаверлівай асцярожнасці вельмі ж наглядна ў наш час выбліскваe з Вашых тэкстаў — нібы кінутае наводкуп: то не да месца — асана камуністам («Калі мы вымаўляем слова камуніст, то ў яго сэнс укладаем усё самае ідэальнае. Сярод ідэальнага конча мы бачым самую чыстую рыцарскую сумленнасць, высакародную партыйнасць і бескампрамісную прынцыповасць»), то знянацкія хваласпевы Брэжневу, Андропаву, Гарбачову (якія, праўда, праз гады закончацца шчырымі шпількамі ў іх адрас)…

Ну а гэты запіс мяне проста спанталычыў — пра Бэла Куна! Доўга і цяжка збіраліся і пісалі… Закончылі ў 1990-м. Аб тым, як некалі ў лагеры ўбачылі ў «арматурнай ведамасці» ягонае прозвішча і змаглі — як бухгалтар агульнага аддзела — праўдай-няпраўдай, са сваім канвойным, наведацца ў яго чацвёрты лагпункт і, прысеўшы поплеч на барачныя нары, пагаварыць. Распавялі яму пра той час, калі ў Мінск у госці прыязджалі венгерскія пісьменнікі Антал Гідаш, Матэ Залка і Бэла Ілеш, «цікавыя, дружныя, слаўныя хлопцы», з якімі давялося разам выступаць на літаратурных вечарах. Залка затым стаў генералам, а Гідаш — зяцем Куна, аб чым апошні Вам тады і расказаў. І нават запытаў: «Як пажывае ваш Янка Купала?» (хоць адкуль Вы маглі *там* тое ведаць?).

Бэла Кун запомніўся вам «у чорным свойскім пінжаку, з коратка пастрыганымі вусікамі на круглявым добрым твары <…> як след удумаўшыся і ўгледзеўшыся, да мяне дайшло: якая гэта велічыня, якая фігура»…

Вы насамрэч так бачылі-ўспрымалі гэтага чалавека — і ў 1991 годзе, калі дапісвалі і публікавалі гэта: з *добрым* тварам, *велічыня*?! Ці ж добры твар у садыста, «залішнюю» крыважэрнасць якога адзначыў нават сам Дзяржынскі?

Гэты ўраджэнец венгерскай Трансільваніі ў 1919-м абвесціў Венгерскую Савецкую Рэспубліку, якая праіснавала ажно 133 дні. А потым — у 1920-м — быў старшынёй Крымскага рэвалюцыйнага камітэта, стаў арганізатарам і актыўным удзельнікам вар'яцкіх масавых забойстваў, калі кроў «чырвонага тэрора» залівала паўвостраў. Ці не чыталі Вы на момант напісання свайго тэкста хоць бы сведчанняў аб тым кактэбельца паэта Максіміліяна Валошына? Ваш калега ды цёзка Іван Шмялёў, які меў няшчасце ў той час жыць у Крыме, спасылаючыся на дакументы саюзаў дактароў, сцвярджаў, што ад вампірска-кунаўскага людажэрства загінула блізу 120 тысяч чалавек…

На жаль, Вы, пэўна, не маглі пабачыць успаміны іншага калегі — Вікенція Верасаева, які ў той 1920 год таксама быў у Крыме, — пра яго размову з Дзяржынскім (у студзені 1923-га), калі на сваё пытанне пра прычыны масавых забойстваў у Крыме (і не толькі белагвардзейцаў ды «буржуяў») — пачуў у адказ: «Видите ли, тут была сделана очень грубая ошибка. Крым был основным гнездом белогвардейщины, и чтобы разорить это гнездо, мы послали туда товарищей с совершенно исключительными полномочиями. Но мы никак не могли подумать, что они так используют эти полномочия». «Из неясных его ответов, — згадаў пра тую размову Верасаеў, — я вывел заключение, что он имел в виду Бела Куна».

Новага вампіра з Трансільваніі, «товарища с совершенно исключительными полномочиями», якога паплечнікі называлі геніем масавага тэрора, расстралялі неўзабаве пасля той Вашай з ім сустрэчы — у 1938 годзе, і — не срэбнымі кулямі. А Вы — пра яго добры твар… І толькі з адной далікатнай агаворкай напрыканцы: «Кажуць, ён быў страшэнна жорсткі і вельмі ахвоча расстрэльваў палонных, не стараючыся ўпэўніцца, што вінаваты яны».

Ці не занадта ж далікатна?

Але прабачце… У вочы я б не сказаў Вам усё гэта…

Пакрысе Вы асталёўваліся ў Мінску, ужываліся, вярталіся. Вярнуліся з чужыны і другая жонка з дачкой. А «кончую» даведку аб сваёй рэабілітацыі Вы атрымалі толькі… 30 сакавіка 1991 года! І тады нарэшце адчулі, мабыць, поўную палёгку ды запісалі: «Можна лічыць, што сёння ў мяне шчаслівы дзень: атрымаў з Вярхоўнага Суда БССР новую даведку, што за свае 19 гадоў я — рэабілітаваны. Бо старая даведка, якую атрымаў у Сухабудзіме, слова гэтага — рэабілітацыя — не мела. І карыстацца ёю было нязручна: справа з-за недаказанасці злачынства спынена, але таго, што я астаўся невінаваты, — не было сказана. А цяпер гэта сказана»…

*

Вы былі надзвычай спагадлівым да ўсяго няшчаснага, пакрыўджанага, недагледжанага, занядбанага — ці гэта людзі (пра многіх пакінулі душэўныя словы-ўспаміны), ці гэта тапаграфічныя мясціны (Вашыя зацемкі пра старую Нямігу, колішні Слуцак), ці — проста малапрыкметныя большасці з нас звычайныя рэчы. Напрыклад — той стары іржавы цвік, які павесілі на сцяне сваёй мінскай кватэры. А перад тым — заўважылі, не прамінулі, падабралі.

«Вось перад маімі вачамі, на сцяне, на нітачцы вісіць з'едзены іржою цвік на 8 сантыметраў, — гэта з Вашай дзённікавай мініяцюры. — Ён, відаць, ніколі не быў у справе, бо не гнуты, з непакамечанаю плешкаю, адно, што па ўсёй сваёй даўжыні іржавы, і так даўно, і так упарта, што нават чутно, узяўшы яго ў рукі, што ён вельмі даўно і вельмі ўпарта валяўся абы-дзе і абы-як, што ўкрыты глыбокаю іржавасцю да таго, што аж чутно гэта ў руках. Як жа я яго мог не падняць, калі яго лёс і мой лёс — аднолькавыя?.. Яго ніхто не шкадаваў, ніхто не пусціў яго ў якую справу. Ён гінуў. Паступова, упарта. Адзін… Няхай хоць у гэтакім стане, што нікуды ўжо ў ніякую справу не годны, — пабудзе спакойна ў мяне. Няхай павісіць у мяне на сцяне — за тое, што ніколі нікому не мог паслужыць добраю справаю».

З гэтай Вашай параллелю-прыпадабненнем, нават лёсавай метафарай я, Ян Аляксеевіч, аніяк не магу пагадзіцца. Прынамсі, часткова. Вы ўсведамлялі сябе старым, іржавым і непатрэбным цвіком, але… Але ўсё ж той вобразны (сімвалічны) цвік мусіў быць гнутым, і шматкроць — як гнулі Вас на лёсавых дарогах, ды і па «плешцы»-галаве Вас не раз білі-«камячылі», а ў «патрэбную», абраную справу — пусцілі, хоць і гінулі Вы не раз… І быў ён — той сімвалічны цвік — яшчэ годны на розныя справы, і літаратурныя, і грамадскія: на адметныя публікацыі, кнігі і рупную працу ў выдавецтвах ды сакратарстве ў Камітэце па Дзяржаўных прэміях.

Стары цвік дрэва (жыццё) не псуе, калі ён не абдзелены ўвагай…

*

Не перастаю здзіўляцца, як пранікнёна-глыбока, шматспектарна, прачула, з душэўнай цеплынёй-пяшчотай і з рацыянальным одумам можаце перадаваць вобразы знаёмых Вам людзей і сваіх літаратурных герояў — у вязанках успамінаў і згадак пра іх, у апавяданнях і аповесцях. У канкрэтных дэталях, якія змаглі выхапіць-падгледзець і запомніць адно Вы. Напрыклад, гэтае: *«Хада такая, што як бы не яна слухалася гаспадара, а гаспадар ішоў туды, куды вялі яго ногі»* (гэта пра паэта Сяргея Фаміна).

А бачыць і запомніць Вам пашчасціла многа — як хоць бы аднойчы ў менскай лазні той «буграваты рубец на Купалавым жываце, што ішоў знізу ўверх наўскасяк, бо рана сшывалася, мабыць, у спяшанні», — рана пасля паэтавай спробы самагубства ў 1930-м.

Мастацкая дэталёвасць — гэта Вашае. Аднак, як некалі запэўніваў Гётэ, апісаць вельмі падобна мопса — не азначае нічога, акрамя таго, што да тысячы ўжо існуючых мопсаў дабавіцца яшчэ адзін… У Вас жа тая дэталёвасць афарбавана багатай душэўнасцю.

Аніякія сучасныя відэакліпы не здольныя паўтарыць-замяніць Вашыя дэталі-назіранні: іх настраёвасць, каларыт, зрухі пачуццяў, атмасферу, абстаноўку — на плошчы ўсяго толькі невялікага сказа ці абзаца. І ўадначас ва ўсім гэтым прасочваецца і Ваш вобраз — успамінальніка, летапісца, мастака, ані ў якім разе не суддзі ці адстароненага канстататара, — вобраз чалавека цнатлівага, пяшчотнага, далікатнага, інтэлігентнага.

Мапасан быў перакананы ў тым, што пісьменніку найперш неабходны зрок, творчы зрок. Так бачыць, як Вы, — нібы праз душэўны рэнтген — людзей могуць нямногія, могуць — абраныя. Вось і зноў успомніліся тыя Вашыя акуляры з дзіўнаватымі падвойнымі лінзамі, запомненыя мной у час нашай сустрэчы, і падумалася: ці і не ў тых шкельцах прычына: дапамагалі сузіраць патаемнае і недасяжнае?..

***Кастрычнік 2026 г.***

## Прэмія Angelus-2026

Чэшская пісьменніца Кацярына Тучкова атрымала Цэнтральнаеўрапейскую літаратурную прэмію Angelus 2026 за раман «Белая вада».




Імёны пераможцаў былі абвешчаныя ў кастрычніку 2026 года падчас цырымоніі ва Уроцлаве ў рамках фестывалю Бруна Шульца. Кацярына Тучкова атрымала 150 000 злотых за раман, прысвечаны лесу манашак, пераследаваных камуністычнымі ўладамі Чэхаславакіі. Кніга была выдадзена на польскай мове выдавецтвам Afera ў перакладзе Юліі Ружэвіч. Перакладчыца таксама атрымала прыз у памеры 40 000 злотых.

Акрамя галоўнага прыза, Тучкова перамагла ў анлайн-галасаванні чытачоў і атрымала прэмію імя Наталлі Гарбанеўскай. Яна ўключае месячную літаратурную рэзідэнцыю ва Уроцлаве. Падчас цырымоніі пісьменніца абвясціла, што выхоўвае дваіх маленькіх дзяцей, таму не зможа правесці ўвесь месяц ва Уроцлаве. Замест гэтага яна вырашыла перадаць рэзідэнцыю ўкраінскай пісьменніцы Юліі Ільюшы, якая трапіла ў шорт-ліст Angelus 2026 са сваёй кнігай «Мае жанчыны». Юлія Ільюша была намінаваная за польскае выданне зборніка «Мае жанчыны» (Moje kobiety) (выдавецтвам KEW у перакладзе Катажыны Фішэр). Гэта зборнік кароткай прозы пра досвед жанчын падчас паўнамаштабнай расійска-ўкраінскай вайны. Ва Украіне кніга была выдадзена ў 2024 годзе. У тым жа годзе яна была перакладзена на англійскую мову і выдадзена ў ЗША пасля перамогі ў міжнародным конкурсе 128 Lit Chapbook.

Усяго ў фінал прэміі трапілі сем кніг пісьменнікаў з шасці краін, два аўтары з Украіны. У фінал таксама выйшаў Сяргей Жадан з кнігай «Арабескі», перакладзенай Міхалам Петрыкам.

Цэнтральнаеўрапейская літаратурная прэмія Angelus — гэта літаратурная ўзнагарода, якая штогод уручаецца, пачынаючы з 2006 года, за найлепшую прозу, выдадзеную на польскай мове ў папярэднім годзе. Арганізатарам і заснавальнікам прэміі з'яўляецца горад Уроцлаў. Лаўрэатам можа стаць пісьменнік з Цэнтральнай Еўропы (Аўстрыя, Албанія, Беларусь, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Эстонія, Латвія, Літва, Македонія, Малдова, Германія, Польшча, Расія, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Венгрыя, Украіна, Харватыя, Чэхія, Чарнагорыя). Прэмія прысуджаецца за найлепшыя празаічныя творы аўтарам, якія ў сваіх тэкстах закранаюць найважнейшыя, найбольш актуальныя тэмы сучаснага свету, даюць штуршок да роздуму і глыбокага пазнання іншых культур.

Сярод папярэдніх лаўрэатаў — Аксана Забужка, Георгій Гаспадзінаў, Сяргей Жадан і Святлана Алексіевіч, якая атрымала прэмію за чатыры гады да Нобелеўскай прэміі па літаратуры.

Аўтары кнігі-пераможцы атрымліваюць 150 тысяч злотых. Усе аўтары, чые кнігі трапляюць у фінал, атрымліваюць па 5000 злотых. Асобна, з 2010 года, уручаецца прэмія «Ангелус» за пераклад — перакладчык кнігі-пераможцы атрымлівае 40 000 злотых.

## Прэмія Kirkus Reviews Fiction

Амерыканская пісьменніца Таяры Джонс атрымала Kirkus Prize 2026 года ў катэгорыі мастацкай літаратуры. Яе раман «Сваяк» быў названы пераможцам на цырымоніі ў Нью-Ёрку.



Разам з Джонс узнагароду атрымалі журналістка Памела Колаф, якая перамагла ў катэгорыі «нявыдуманай» літаратуры за раман «Злавіць д'ябла: праўдзівая гісторыя забойства», і пісьменніца Элізабэт Асеведа, якая перамагла ў катэгорыі літаратуры для моладзі за раман «Гнеў — гэта толькі цень». Кожны з трох пераможцаў атрымаў па 50 000 долараў.

## Скандал па Букеру

Раман пісьменніцы з ЗША Эмы Кляйн «Салодкая» быў уключаны ў доўгі спіс сёлетняй Букераўскай прэміі, але не трапіў у кароткі спіс. Гэтае рашэнне выклікала шквал крытыкі сярод рэцэнзентаў і чытачоў.

На думку экспертаў і аматараў кніг, раман амерыканскай пісьменніцы пра чалавека, які пакутуе ад цяжкай хваробы і шукае выйсця, незаслужана не трапіў у кароткі спіс прэміі. «Гісторыя чалавека з дэменцыяй, які трапляе ў швейцарскую клініку дапамогі, можа не гучаць як кніга, якая павінна адразу ж апынуцца на вяршыні вашай кніжнай паліцы. Але, нягледзячы на змрочную ідэю, кніга Эмы Кляйн — адна з самых вядомых кніг года», — сцвярджалася ў допісах. Многія былі ў захапленні ад гісторыі Эмы Кляйн і не разумеюць, чаму кніга не трапіла ў кароткі спіс. Падобнае меркаванне выказалі як брытанскія аўтары бэстсэлераў, так і літаратурныя крытыкі і рэцэнзенты — яны не разумеюць, чаму журы вырашыла адкрыта праігнараваць адзін з найлепшых раманаў 2026 года.



«Калі сяброўку журы Букераўскай прэміі Патрысію Локвуд спыталі пра тое, чаму раман не трапіў у шорт-ліст, яна адказала, што журы мусіла праігнараваць "цыклы ажыятажу"». СМІ дадаюць, што, на думку крытыкаў, рашэнне журы Букераўскай прэміі супярэчыла водгукам і рэцэнзіям шэрагу спецыялізаваных парталаў. Аднак у артыкуле рэзюмуецца, што найбуйнейшая англамоўная прэмія відавочна прайграла ад адсутнасці гэтага тэксту.

У шорт-ліст Букераўскай прэміі 2026 года ўваходзяць шэсць аўтараў з рознымі гісторыямі — ад класікі брытанскай гісторыі да падзей на Ямайцы.

## Літпрэмія за кнігі штучнага інтэлекту

У Францыі заснавана літаратурная прэмія за творы, напісаныя з дапамогай штучнага інтэлекту. Ініцыятыва з'явілася на фоне скандалаў вакол магчымага выкарыстання штучнага інтэлекту ўдзельнікамі іншых літаратурных конкурсаў.

Прэмія называецца Prix Pascal de Littérature IA. Заяўкі прымаюцца з 20 кастрычніка па 30 лістапада 2026 года. Журы абярэ дзесяць намінантаў, а пераможца будзе абвешчаны ў пачатку снежня. Арганізатары падкрэсліваюць, што ацэняць літаратурную якасць твораў. У склад журы ўвойдуць пяць пісьменнікаў, крытыкаў, выдаўцоў, філосафаў і журналістаў.

Ідэю прэміі прэзентаваў Аляксандр Гефен, дырэктар Нацыянальнага цэнтра навуковых даследаванняў Францыі, які вывучае ўзаемасувязь літаратуры і лічбавых тэхналогій. «Прэмія Паскаля павінна каранавацца найлепшы тэкст, калі-небудзь створаны штучным інтэлектам», — цытуе яго словы Livres Hebdo.

На конкурс прымаюцца неапублікаваныя мастацкія творы на французскай мове аб'ёмам каля 300 000 знакаў. Падаць заяўку можа кожны, незалежна ад нацыянальнасці або вопыту пісьменніцтва. Прысутнасць выдаўца не патрабуецца, а рукапісы будуць ацэньвацца ананімна. Заяўка павінна ўтрымліваць сам твор, кароткае апісанне ідэі аб'ёмам каля 4000 знакаў і тэхнічнае дасье з інфармацыяй аб выкарыстанай моўнай мадэлі і запытамі да яе. Арганізатары называюць такія рукапісы iauscrit — спалучэннем французскіх слоў IA («штучны інтэлект») і manuscrit («рукапіс»). Акрамя літаратурнай якасці, твор павінен быць карысным, папярэджваць аб небяспецы або прапаноўваць арыгінальнае рашэнне экалагічных, сацыяльных або этычных праблем. Пераможца атрымае грашовы прыз, а яго рукапіс будзе апублікаваны. Арганізатары заклікаюць аўтараў адкрыта заяўляць аб выкарыстанні штучнага інтэлекту замест таго, каб спадзявацца на дэтэктары.

## ШЭКСПІР як суаўтар

Гістарычная п'еса «Эдуард III», апублікаваная ананімна ў 1596 годзе, цяпер павінна быць уключана ў канон твораў Уільяма Шэкспіра. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы на падставе вынікаў камп'ютэрнага аналізу тэксту. Другі вынік таксама стаў сенсацыйным: у п'есе былі знойдзены сляды творчасці іншага драматурга — Крыстафера Марло, галоўнага суперніка Шэкспіра. Эксперты даўно сцвярджалі, што Шэкспір напісаў прынамсі некалькі сцэн з «Эдуарда III», хоць п'еса і не ўвайшла ў «Першае фоліа» (зборнік п'ес Шэкспіра) у 1623 годзе. Цяпер даследчыкі Роры Лафнэйн і прафесар Брэт Грэтлі-Хірш параўналі тэкст з творамі 10 драматургаў, якія працавалі з канца 1580-х да сярэдзіны 1590-х гадоў, і падзялілі п'есу на некалькі частак. Згодна з іх вывадамі, 23 фрагменты — большасць — былі напісаны Шэкспірам, а яшчэ дзевяць — Марло, аўтарам «Трагічнай гісторыі доктара Фаўста»: «Гэта новая знаходка, і гэта азначае, што п'еса — новае супрацоўніцтва паміж аўтарамі». Паводле меркавання навукоўцаў, праца над «Эдуардам III» павінна быць датавана прыблізна 1592 годам. Папярэднія даследаванні, праведзеныя ў 2016 годзе, засведчылі, што Марло ўнёс свой уклад у трылогію пра Генрыха VI, таму новыя дадзеныя сведчаць пра больш глыбокае творчае партнёрства паміж двума маладымі драматургамі, а не пра суперніцтва.

## Дарагая старая кніга НЬЮТАНА

Асобнік першага выдання знакамітай кнігі Ісаака Ньютана, якая заклала асновы класічнай фізікі, — «Матэматычныя пачаткі натуральнай філасофіі» — упершыню надрукаваны ў Лондане ў 1687 годзе, нядаўна быў прададзены на аўкцыёне за 576 тысяч долараў. Твору амаль 340 гадоў, і яго ўладальнікамі былі брытанскія арыстакраты і вядомыя калекцыянеры.

Менавіта ў гэтай працы Ньютан сфармуляваў тры законы руху і закон сусветнага прыцягнення, якія змянілі ўяўленні чалавецтва пра будову Сусвету. Да з'яўлення кнігі рух нябесных цел вывучалі Мікалай Капернік, Галілеа Галілей і Іаган Кеплер. Аднак Ньютан здолеў матэматычна паказаць, што рух планет і падзенне аб'ектаў на Зямлю падпарадкоўваюцца агульным фізічным законам. Даследаванні Ньютана пераканаў апублікаваць астраном Эдманд Галей, які асабіста і дапамагаў падрыхтаваць кнігу да публікацыі.

## Украіна чытацкая

33% украінцаў, паводле вынікаў праведзенага Міністэрствам культуры Украіны даследавання «Чытанне ва Украіне: паводзіны, матывацыя і інструменты ўзаемадзеяння», чытаюць некалькі разоў на тыдзень, а 87% чытачоў выбіраюць кнігі на ўкраінскай мове.

Даследаванне тычылася чытацкіх паводзінаў, моўных перавагаў, выдаткаў на кнігі і даступнасці кнігарняў і бібліятэк. «Мы працуем над умацаваннем кніжнага сектара і развіццём культуры чытання ва Украіне. Даследаванне дапамагае нам лепш разумець патрэбы чытачоў і абапірацца на рэальныя дадзеныя пры прыняцці рашэнняў па развіцці кніжнага сектара. Мы бачым канкрэтныя лічбы... Амаль 40% украінцаў могуць пачаць чытаць больш дзякуючы выпадковай сустрэчы з цікавай кнігай. Таму мы павінны зрабіць так, каб гэтая сустрэча адбывалася як мага часцей», — сказала намесніца прэм'ер-міністра Украіны па пытаннях гуманітарнай палітыкі — міністр культуры Украіны Таццяна Бяражная.

Міністэрства культуры Украіны будзе выкарыстоўваць вынікі даследавання пры прыняцці рашэнняў па падтрымцы кнігавыдання і прасоўванні чытання. Згодна з яго вынікамі, кожны дзясяты ўкраінец (12%) сцвярджае, што чытае або слухае кнігі кожны дзень або амаль кожны дзень, кожны пяты (21%) — некалькі разоў на тыдзень. Двое з трох рэспандэнтаў (59%) чыталі або слухалі кнігі хаця б некалькі разоў на месяц на працягу апошняга года. Пры гэтым, як было адзначана, 13% рэспандэнтаў зусім не чыталі за гэты перыяд.